КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 30 (253) ◂ 19 жніўня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ФЁДАР МІРЗАЯНАЎ**

Стар. 4

**З КАЛОНІІ НА КАНЦЭРТ**

Самым маладым сярод чарговай у гісторыі Беларусі хвалі палітвязняў быў Сяргей Казакоў — таленавіты музыка-самавук, якому ўжо ў следчым ізалятары споўнілася 19 гадоў

Стар. 5

**ЦІ ПЕРАМОЖА БРЫТАНІЯ ІНТЭРНЭТ?**

Брытанскія кансерватары ў якасці перастрахоўкі ад новых моладзевых бунтаў плануюць абмежаваць доступ да сацыяльных сетак

Стар. 13

**ЛЕАНІД ЛЫЧ: ПЕРАБУДОВА ЯК ФАКТАР БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ**

Стар. 14

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ТАЦЦЯНА РЭВЯКА**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# ШТО СТАІЦЬ ЗА «СПРАВАЙ БЯЛЯЦКАГА»?




**Аляксей КАРОЛЬ**

**Палітычнае лета–2011 для дэмакратычных сіл Беларусі адзначана адной перамогай — акцыяй «Стоп-бензін», напалову перамогай — акцыяй «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» і нечаканай драматычнай паразай — арыштам аднаго з выбітных праваабаронцаў, лідара незарэгістраванай грамадскай арганізацыі «Вясна» Алеся Бяляцкага.**

Параза не па ўласнай віне, а ўдарам у спіну, што нанеслі літоўскія і польскія сябры-дэмакраты, ад якіх да таго мелі адно — падтрымку. І не па прычыне ўласнай слабасці праваабарончай дзейнасці, а хутчэй па прычыне яе нечаканых для беларускіх уладаў моцы, прынцыповасці і непахіснасці, нягледзячы на няспынныя рэпрэсіі і запалохванні, вобшукі на офісе і прыватных кватэрах праваабаронцаў.

Афіцыйнае абвінавачванне Алесю Бяляцкаму — ухіленне ад выплаты падаткаў з тых сум, што ўтрымліваліся на рахунках у замежных банках. Гэтыя сродкі ішлі на дапамогу рэпрэсаваным. Інфармацыю беларускаму боку перадалі Міністэрства юстыцыі Літвы і Генеральная пракуратура Польшчы. Пры гэтым Польшча здала сваю інфармацыю ўжо тады, калі Бяляцкі сядзеў у турме.

Напачатку вельмі стрыманыя і ўхілістыя тлумачэнні прадстаўнікоў вышэйназваных установаў гэтай акцыі на сённяшні дзень зводзяцца да агульнай высновы: беларускія ўлады знайшлі магчымасць скарыстацца сістэмай міжнародных працэдур і дамоваў аб фінансавых трансакцыях, закліканай садзейнічаць кантролю над тэрарызмам і злачыннасцю для атрымання інфармацыі, якую яны затым выкарысталі для рэпрэсій у адносінах да ўласных грамадзян.

Перадача інфармацыі адбывалася на падставе двухбаковых дамоваў з Беларуссю аб прававой дапамозе ад 1992 года. Але чаму і дамовы, дый уся сістэма не былі выкарыстаны раней? Чаму не «здавалі» сваіх сяброў ні пры Адамкусе, ні пры Бразаўскасе?

Думаю, што галоўныя прычыны палягаюць не ў інтрызе беларускіх уладаў (якая несумненна), а ва ўнутраных палітычных складніках і тэндэнцыях — што ў Літве, што ў Польшчы.

На жаль, дакладных фактаў аб тым, як выспявала і фарміравалася гэтая справа, хто яе ініцыятары і праваднікі, вельмі мала. І прарываюцца гэтыя факты ў публічную сферу кроплямі, выключна пад ціскам хвалі асуджэння і абурэння з боку палітыкаў, аналітыкаў і журналістаў у Польшчы, Літве, іншых краінах ЕС. Тых, хто за фактам здрады беларускім дэмакратам адчулі пагрозу ўласным дэмакратычным здабыткам.

Вось асноўныя факты.

Беларускія ўлады звярнуліся ў лютым 2011 года да шэрагу краін ЕС з просьбай аб фінансавай інфармацыі. Здалі інфармацыю Літва — у сакавіку, і Польшча — у чэрвені. І не толькі на праваабаронцаў. Літоўскі бок задаволіў больш за 400 запытаў беларускіх уладаў. Польскі — толькі 16 і толькі ў гэтым годзе (?). На каго — адказу пакуль няма. Днямі адкрылася, што з беларускімі ўладамі супрацоўнічае і падатковая інспекцыя Літвы.

Прадстаўнікі вышэйназваных ведамстваў напачатку скандалу ў сваё апраўданне спасылаліся, што яны не падазравалі наконт магчымага выкарыстання банкаўскіх дадзеных дзеля палітычных рэпрэсій, не ведалі, хто такі Бяляцкі. Хутка, аднак, высветлілася, што міністэрствы замежных спраў абодвух краін пасля 19 снежня правялі кансультацыі з адпаведнымі ведамствамі аб умацаванні бяспекі, якая тычыцца банкаўскіх рахункаў грамадзян Беларусі. Аб тым жа цвердзілі НДА і эксперты на шматлікіх нарадах з прадстаўнікамі гэтых ведамстваў.

На пачатку скандалу вельмі стрыманай была і рэакцыя ўладных асоб і структур абедзвюх краін: прыкрая памылка, інцыдэнт, бюракратычны збой, які асуджаем, які не паўторыцца, але спецыяльнага расследавання не патрабуе. Асабліва настойліва гэтай высновы прытрымліваецца міністр юстыцыі Літвы Рэмігіюс Шымашус.

Аператыўна і даволі жорстка асудзілі гэты інцыдэнт найперш парламентарыі і міністры замежных спраў. Парламент Літвы прызначыў спецыяльную камісію па яго расследаванні. Папрасілі прабачэння прэм'еры і прэзідэнт Польшчы. Урэшце і прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ, на якую пасыпаліся абвінавачванні ў прыхаваным садзейнічанні ў выдачы інфармацыі, на 19 жніўня выклікала «на дыван» міністра юстыцыі. У адстаўку адпраўлены два кіраўнікі міжнароднага аддзелу Генеральнай пракуратуры. Урэшце — на дадзены момант гэта галоўнае — Літва і Польшча спынілі юрыдычнае супрацоўніцтва з беларускім бокам.

Чыйсьці разлік на нейкія палітычныя здабыткі праваліўся. Пытанне, чый і на што? Як падаецца, гэты інцыдэнт ёсць праяўленне вядомай з гісторыі тэндэнцыі рэваншу з боку звергнутых палітычных сіл, што змаглі прыстасавацца і мімікраваць пад прыхільнікаў новых парадкаў. У дадзеным выпадку — рэваншу на аднаўленне аўтарытарнай палітычнай сістэмы. Не абавязкова прыхільнікаў з ліку былых камуністычных функцыянераў і сістэмы ў старым фармаце.

Спакуса аднавіць аўтарытарны рэжым не пад дыктатам Крамля, а ў нацыянальным маштабе, можа падацца прывабнай і для новых, з маладых палітыкаў, што прыйшлі да ўлады праз дэмакратычныя працэдуры. І маюць ілюзіі праз ліквідацыю гэтых самых працэдур, затрымацца ва ўладзе назаўсёды.

Можа падацца прывабнай гэта ідэя і для часткі бізнэсоўцаў: пад дахам аўтарытарнай улады пазбавіцца ад канкурэнцыі і прырасціць свой капітал. Дапамагчы беларускаму рэжыму расправіцца са сваёй апазіцыяй, каб аслабіць уласную, — абсалютна ў логіцы падобнага кшталту палітычных сіл.

Хутчэй за ўсё, выдача рахункаў не была сігналам да непасрэднага перавароту, але пэўнай спробай сіл (магчыма, абсалютна спантаннай, неарганізаванай, справакаванай адным-двума палітыкамі). Сігнал трывогі для дэмакратычных сіл нашых суседзяў прагучаў. Яны яго, здаецца, распазналі.

Відавочна, што правалілася і задума беларускіх уладаў перавесці стрэлкі з палітычнага пераследу на быццам чыста эканамічны. Супадзенне па часе вызвалення 9 палітвязняў і арышту Алеся Бяляцкага тут наўрад ці выпадковае. Перавесці, падмяніць, але пры гэтым цалкам захаваць кантроль над апазіцыяй, як і ўсю сістэму застрашвання грамадства.

Правалілася таксама спроба пасварыць беларускую апазіцыю з дэмакратычнымі сіламі Літвы і Польшчы, краінамі ЕС, якія пацвердзілі сваю рашучасць дапамагаць дэмакратычным сілам Беларусі.

Цяпер іх гонарам з'яўляецца справа дамагчыся вызвалення чалавека, які па іх віне апынуся за кратамі, — Алеся Бяляцкага.

АДКАЗ

# ЗАКОН НЕ ПАРУШАЎСЯ

**Лідар Руху «За Свабоду» атрымаў адказ на свой зварот ад кіраўніка галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў спадара Кубракова.**

Аляксандр Мілінкевіч імкнуўся атрымаць афіцыйны адказ, якія законныя сродкі самаабароны могуць ужываць грамадзяне краіны ў выпадку нападу невядомых грамадзян, а таксама калі нападнікі з'яўляюцца пераапранутымі ў цывільную вопратку супрацоўнікамі падраздзяленняў МУС, але пры затрыманні мірных грамадзян не выконваюць прадугледжаную законам працэдуру затрымання, часам ужываючы пры гэтым фізічную сілу і спецыяльныя сродкі, а таксама калі затрыманне мірных грамадзянаў ажыццяўляюць супрацоўнікі падраздзяленняў МУС, але пры гэтым незаконна прымяняюць фізічную сілу і спецыяльныя сродкі, не выконваюць прадугледжаную законам працэдуру затрымання.

Спадар Кубракоў адзначыў у сваім адказе, што акцыі кампаніі «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» былі несанкцыянаванымі, удзельнікі акцый нібыта перашкаджалі руху пешаходаў, працы грамадскага транспарту і гандлёвых аб'ектаў. Нашэнне цывільнага адзення супрацоўнікамі міліцыі прадугледжана нарматыўна-прававымі актамі. Маўляў, ніякіх парушэнняў правоў грамадзян з боку міліцыі не было, таму весці гутарку пра самаабарону з боку ўдзельнікаў недазволеных акцый немэтазгодна.

Як вядома, менавіта брутальныя арышты ўдзельнікаў «маўклівых акцый» па серадах невядомымі асобамі, якія карысталіся аўтатранспартам без нумарных знакаў і адмаўляліся дэманстраваць свае пасведчанні, выклікалі рэзананс ва ўсім цывілізаваным свеце.

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду»**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЦІСК НА АДВАКАТАЎ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Вольга ХВОІН**

**Тамару Сідарэнка, адваката, якая абараняла правы экс-кандыдатаў у прэзідэнты Дзмітрыя Уса, Уладзіміра Някляева, літаратара Міхася Башуры, актывіста Андрэя Кіма, пазбавілі ліцэнзіі.**

Сідарэнка не дазволілі прайсці пераатэстацыю ў Мінюсце. Матывавалі гэта тым, што яе ўжо пазбавілі ліцэнзіі. На пасяджэнні кваліфікацыйнай камісіі па пытаннях адвакацкай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь 16 жніўня было прынятае рашэнне аб спыненні дзеяння ліцэнзіі адвакату Тамары Сідарэнка. Падставы спынення дзеяння ліцэнзіі пакуль невядомыя.

Вясной гэтага года пачаўся ціск на адвакатаў, якія абаранялі «палітычных падсудных». Аналагічная працэдура пазбаўлення ліцэнзіі была ўжытая да іншых адвакатаў, якія абараняли ўдзельнікаў падзей 19 снежня 2010 года. Былі пазбаўленыя ліцэнзіі адвакат А. Агееў, які бараніў А. Міхалевіча, яго маці адвакат Т. Агеева, яго жонка адвакат З. Залеўская, адвакаты У. Тоўсцік і Т. Гараева, якія баранілі І. Халіп. Адвакат Павел Сапелка, які бараніў А. Саннікава, быў выключаны са складу Мінскай гарадской калегіі адвакатаў па прадстаўленні Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

У часе разгляду атэстацыйных камісій не былі атэставаны адвакаты, якія ўдзельнічалі ў справе аб падзеях 19 снежня 2010 года, Д. Ліпкіна, якая бараніла М. Ліхавіда, А. Бахціна, якая бараніла І. Халіп, а таксама А. Бурак, якая бараніла А. Класкоўскага і А. Лябедзьку. Разам з тым рашэнне кваліфікацыйнай камісіі па пытаннях адвакацкай дзейнасці аб пазбаўленні іх ліцэнзіі на права ажыццяўлення адвакацкай дзейнасці не прымалася.

Некалькі адвакатаў сёлета самі сышлі з Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, каб перачакаць смутныя часы ды не падставіць пад пагрозу ліквідацыі сваю прафесійную дзейнасць.

«Справа 19 снежня паказала, што адвакату даводзіцца прымаць рашэнне, улічваючы больш фактараў, чым калі бярэшся за іншую справу. Наконт сябе я хачу сказаць: у мяне не стаяла такое пытанне, калі са мной заключалі пагадненне. Бо пагадненне мы заключалі з жонкай падабароннага яшчэ 17 снежня на аказанне юрыдычнай дапамогі на выпадак, калі будуць нейкія непаразуменні, нейкая адміністрацыйная адказнасць. Але, як гаварыў мой калега, і я тое ж кажу, што я не шкадую аб сваім удзеле ў гэтай справе, наадварот, я адчуваю прафесійны гонар, радасць, што мне давялося мець да яе дачыненне», — зазначае адвакат Тамара Сідарэнка.

Сідарэнка Тамара Аляксандраўна працуе адвакатам з 1978 года ў юркансультацыі Ленінскага раёна г. Мінска (спецыяльны дазвол — ліцэнзія на занятак адвакацкай дзейнасцю № 506, ад 26.12.2003 г.). Яна — юрыст высокага ўзроўню, неаднаразова была кіраўніком стажыровак маладых адвакатаў, карыстаецца вялікім аўтарытэтам у калектыве. Тамару Сідарэнка і Мінская калегія адвакатаў, і Мінюст у мінулыя гады ўганароўвалі за добрую працу.

ЦІКАВА

# НАРОДНЫ СХОД ЧАКАЕ САЎДЗЕЛУ

**Марыя КРУК**

**Арганізатары Народнага сходу заклікаюць людзей ужо цяпер фармуляваць свае патрабаванні да ўладаў, а таксама дапамагчы ў правядзенні мерапрыемства хто чым зможа.**

Народны сход апазіцыйныя сілы плануюць правесці 8 кастрычніка ў Мінску, ва ўсіх абласных гарадах і 48 райцэнтрах. На Народных сходах мусяць быць прынятыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя патрабаванні да ўладаў. Таксама плануецца абраць паўнамоцных прадстаўнікоў Народных сходаў, якія і перададуць сфармуляваныя патрабаванні прадстаўнікам органаў улады. Будзе прызначана і дата наступных Народных сходаў, дзе агучаць рэакцыю ўладаў на патрабаванні людзей і прынятыя захады па вырашэнню сацыяльна-эканамічных праблем. Арганізатары мерапрыемства гавораць, што да іх працы далучыліся амаль усе палітычныя партыі і рухі краіны, і заклікаюць грамадзян зрабіць свой пасільны ўнёсак у арганізацыйную працу.

«Няма банка, які б фінансаваў гэтае мерапрыемства. Гэта ўсё творчасць грамадзян. Нехта ўкладвае свае сродкі і рэсурсы, а нехта траціць свой асабісты час на дапамогу арганізацыі. Таму мы заклікаем усіх, хто не хоча, каб наша жыццё было такім змрочным і бесперспектыўным, як сёння, укладаць, што магчыма», — заявіў кіраўнік партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін.

Дапамагчы арганізатарам Народнага сходу паабяцаў і Вячаслаў Дыянаў, які меў дачыненне да мабілізацыі людзей на летнія акцыі маўклівага пратэсту.

Які ў Народнага сходу будзе вынік, па словах арганізатараў, пакажуць дзеянні ўладаў. То бок у чарговы раз рэжыму Лукашэнкі хочуць зладзіць праверку на адпаведнасць Канстытуцыі.

ПАДЗЕЯ

# ТЫДЗЕНЬ НЕФАРМАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**«Нефармальная адукацыя і рэгіянальнае развіццё» — пад такой назвай з 24 верасня па 2 кастрычніка 2011 года ў Беларусі будзе праходзіць шосты Тыдзень нефармальнай адукацыі.**

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у беларускім грамадстве сфармаваўся пэўны попыт на розныя праграмы навучання, накіраваныя на асабістае, сацыяльнае і прафесійнае развіццё. Гэта характэрна не толькі для сталіцы і абласных цэнтраў, але і для малых гарадоў, сельскай мясцовасці. Пры гэтым прапанова паслуг і праграм дадатковай адукацыі дарослых па-ранейшаму ў асноўным засяроджана ў Мінску.

Арганізатары Тыдня НФА–2011 робяць акцэнт на праблемах развіцця нефармальнай/дадатковай адукацыі ў рэгіёнах Беларусі і прапаноўваюць абмеркаваць шэраг пытанняў. Якія існуюць магчымасці і перспектывы развіцця нефармальнай/дадатковай адукацыі дарослых у малых гарадах і сельскай мясцовасці? Якія актуальныя падыходы, формы, кірункі гатовыя прапанаваць беларускія спецыялісты? Як можна выкарыстоўваць замежны і айчынны досвед для таго, каб адукацыйныя паслугі ў сферы НФА зрабіць прывабнымі для спажыўцоў у рэгіёнах?

Традыцыйна мерапрыемствы будуць праходзіць у розных гарадах Беларусі. Ключавой падзеяй Тыдня НФА–2011 стане круглы стол «Нефармальная адукацыя ў рэгіёнах Беларусі: запатрабаванні, досвед, інавацыі», які пройдзе 28 верасня 2011 года ў Мінску. Ён стане дыскусійнай пляцоўкай, на якой эксперты, прадстаўнікі арганізацый дзяржаўнага, грамадскага і бізнэс-сектараў абмяркуюць стан і праблемы нефармальнай і дадатковай адукацыі ў рэгіёнах Беларусі, а таксама ролю НФА ў рэгіянальным развіцці.

Да ўдзелу ў Тыдні НФА–2011 запрашаюцца арганізацыі, якія займаюцца нефармальнай і дадатковай адукацыяй дарослых, а таксама арганізацыі, гатовыя аказаць садзейнічанне і падтрымку ў правядзенні Тыдня НФА. Прыём заявак і прапаноў працягнецца да 29 жніўня 2011 года.

Арганізатарамі тыдня выступаюць: Установа адукацыі «Міжнародны прыватны навучальны цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БелТЮФ», ТАА «Трэнінгавы цэнтр «Квадратны апельсін», Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы (АДАіА), Прадстаўніцтва зарэгістраванага таварыства «Deutscher Volkshochschul-Verband eV» (Федэратыўная Рэспубліка Германія) у Рэспубліцы Беларусь.

Падрабязная інфармацыя пра Тыдзень НФА–2011 размешчана на сайце www.adukatar.net.

ФЭСТ

# ВОЛЬНАЕ ПАВЕТРА

**Вольга ХВОІН**

**Этна-фестываль «Вольнае паветра» збярэ гасцей 27 жніўня на хутары Шаблі. Арганізатары фэсту абралі гэтае месца, бо яно надзвычай атмасфернае. І таму абяцаюць гасцям адпаведную музыку і забавы.**

На хутары Шаблі ў васьмідзесяці кіламетрах ад сталіцы выступяць паўтара дзясяткі артыстаў з розных краін, якія спалучаюць этнічную музыку з сучасным гучаннем. Усе замежныя артысты фестывалю наведаюць Беларусь упершыню: «Shazalakazoo» (Сербія), «Комба-бакх» (Расія), «Sovijus» (Літва), DJ Wojcio (Польшча), «Бадьян Сауна Сістэм» (Украіна). Беларусь будуць прадстаўляць калектывы «Нагуаль», «Dzivasil», «Gurzuf», «Morfe Acoustic Band», а таксама шэраг ды-джэяў.

У фэсце не будуць удзельнічаць такія вядомыя гурты, як «Крыві», «Палац», «Аляксандра і Канстанцін». Арт-дырэктар фэсту Аляксандр Багданаў гэта тлумачыць намерам паказаць публіцы іншы бок этнічнай музыкі. «Асноўнай задачай фестывалю мы ставім адукацыю публікі. То бок мы хочам данесці да беларускай публікі, што існуе і іншы фолк», — зазначае Багданаў.

Беларускамоўныя песні ёсць у рэпертуары айчыннага калектыву «Dzivasil» і ў расійскага гурта «Комба-бакх». На творчасць апошняга Багданаў раіць звярнуць асаблівую ўвагу. «У іх усяго пяцьдзесят альбомаў, некалькі альбомаў выкладзеныя ў сеціве. У кожным альбоме гэтага нават не гурту, а творчай кааліцыі, ёсць некалькі трэкаў па-беларуску, бо некаторыя музыкі родам з Беларусі, таму яны аддаюць сваім караням. І часам робяць трэкі па-беларуску, нягледзячы на тое, што самі жывуць у горадзе Кастрама», — распавёў арт-дырэктар фэсту.

Гасцей «Вольнага паветра» чакаюць гульні, кінатэатр пад адкрытым небам і нават адкрыты чэмпіянат па кіданню каровіных кізякоў. Арганізатары нават парупіліся пра адпаведны інвентар і расходныя матэрыялы для згаданых спаборніцтваў.

Арганізатары «Вольнага паветра» гатовыя прыняць да 1500 гледачоў.

Важная інфармацыя: да панядзелка, то бок да 22 жніўня, кошт квіткоў такі: 20 тысяч рублёў каштуе ўваход, 50 тысяч рублёў госці мусяць заплаціць за ўваход і месца на кемпінгу для намёту (але колькі чалавек будзе жыць у намёце, ніхто не рэгламентуе). Ад панядзелка, у сувязі з нестабільнай эканамічнай сітуацыяй, кошт квіткоў узрасце на 20 тысяч беларускіх рублёў.

Час правядзення фестывалю: 27 жніўня ад 15.00 да 6.00. Месца правядзення: хутар Шаблі, в. Малое Запруддзе, Валожынскі раён — 80 кіламетраў ад Мінска ў бок Вільнюса. Арыенцір — в. Гарадзькі.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХТО ЗДАЎСЯ?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Пасля працяглых прапагандысцкіх і гандлёвых войнаў Масква нечакана расплылася мёдам перад Беларуссю. «Я вельмі рады, што ў нас сёння ёсць магчымасць пагаварыць у двух фарматах: і ў межах двухбаковых адносін, і ў межах нашых інтэграцыйных працэсаў. У цэлым сітуацыя складваецца нядрэнна», — заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, адкрываючы 15 жніўня сустрэчу з кіраўніком беларускага ўрада Міхаілам Мясніковічам у вузкім фармаце.**

Больш за тое, Пуцін лічыць, што фармаванне Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі не памяншае актуальнасці задачы развіцця Масквой і Мінскам Саюзнай дзяржавы. «Мы лічым, што разнахуткасны рух у сферы інтэграцыі апраўданы. Па некаторых кірунках Саюзная дзяржава яўна абганяе Мытны саюз і Адзіную эканамічную прастору будучую», — цытуе Пуціна РІА «Новости».

Што б гэта азначала? Няўжо змярцвелая Саюзная дзяржава, на костках якой паспелі патанчыць шмат палітолагаў, уздымаецца з попелу? Дагэтуль памятаецца пуцінскае «мухі асобна, катлеты асобна», а тут раптам — на табе! Саюзная дзяржава ці не ўпершыню пачала размаўляць не вуснамі фантазёра і экстрэмальнага турыста Паўла Барадзіна, а словамі чалавека, які, здаецца, раней яе на дух не пераносіў.

З чаго Пуцін згадаў пра Саюзную дзяржаву? Здаецца, Мінск нешта паабяцаў Маскве. Пытанне толькі, што?

**Ужо безліч разоў Беларусь вінаваціліў пастаўках зброі. Усе гэтыя інфармацыйныя паведамленні з рэгулярнасцю абвяргаюцца беларускімі ўладамі. Калі скандалы ўзнікаюць рэгулярна — можа, нешта за гэтым ёсць?**

Ускосна на гэта адказвае і сам Пуцін. Прыкладам, Расія з 2012 года ўвядзе паніжальны каэфіцыент пры вызначэнні цаны на газ для Беларусі. Але… «Газа ў абмен на пацалункі» не будзе. Канчатковыя дамоўленасці будуць звязаныя з набыццём «Газпрамам» астатніх 50% акцый «Белтрансгаза». Пра гэта таксама паведаміў Пуцін.

Вядома, што ў павестцы дня прэм'ераў былі пытанні супрацоўніцтва ў сферы атамнай энергетыкі, нафтаперапрацоўчай прамысловасці, вытворчасці мінеральных угнаенняў, аўтамабілебудавання, рэалізацыі сумесных інвестыцыйных праектаў.

То бок, па ўсіх стратэгічных напрамках, куды б Расія магла ўкласці грошы і атрымаць кантроль над беларускімі прадпрыемствамі. Гэта такая сабе эканамічная экспансія.

Больш за тое, нельга скідваць з уліку і словы Пуціна аб «больш шчыльнай інтэграцыі». Выступаючы 1 жніўня ў Цвярской вобласці на моладзевым форуме «Селігер–2011», Пуцін заявіў, што Лукашэнка паслядоўна ідзе па шляху інтэграцыі з Расіяй. На пытанне, ці могуць Расія і Беларусь стаць адным цэлым, як гэта было ў часы Савецкага Саюза, прэм'ер адказаў: «Гэта магчыма, вельмі пажадана і поўнасцю залежыць — на 100% залежыць — ад волевыяўлення беларускага народа».

Як забяспечваецца «волевыяўленне» — мы ўсе ведаем…

Тым не менш, на тыдні былі вызваленыя 9 удзельнікаў «Плошчы–2010». Згодна з указам прэзідэнта аб памілаванні, 13 жніўня з бабруйскай калоніі выйшлі Дзмітрый Дрозд, Арцём Грыбкоў і Сяргей Казакоў, з калоніі пад Магілёвам — Яўген Сакрэт і Уладзімер Хамічэнка, з калоніі ў Віцебскім раёне — Уладзімір Яроменак, з аршанскай калоніі — Васіль Парфянкоў. Пацвердзілася таксама інфармацыя аб вызваленні з наваполацкай калоніі Віталя Мацукевіча. Крыху пазней стала вядома, што з калоніі ў Івацэвічах вызвалены Аляксандр Кваткевіч.

Чуткі пра тое, што вызваляць, прыкладам, больш значных фігурантаў «справы па Плошчы», — кандыдатаў у прэзідэнты Андрэя Саннікава, Аляксандра Класкоўскага, Мікалая Статкевіча, Дзмітрыя Уса, — не спраўдзіліся. Асабліва, канешне, на гэта ніхто не разлічваў. Указ аб памілаванні дзевяці фігурантаў крымінальнай справы аб масавых беспарадках 19 снежня 2010 года быў падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам 11 жніўня. «Такое рашэнне прынята на падставе просьбаў названых асоб з улікам таго, што яны ўсвядомілі супрацьпраўны характар сваіх дзеянняў, прызналі віну і шчыра раскаяліся», — паведаміла прэсслужба прэзідэнта, не называючы прозвішчы памілаваных.

Зняволеныя экс-кандыдаты ў прэзідэнты Беларусі — Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч і Дзмітрый Ус — прашэнняў аб памілаванні не падавалі. Між тым, як лічыць палітолаг, аўтар кнігі «Аляксандр Лукашэнка: палітычная біяграфія» Валер Карбалевіч, для самога Лукашэнкі прашэнне аб памілаванні надзвычай важна персанальна. «Гэта элемент улады. Такім чынам прасіцелі не толькі прызнаюць свае памылкі, яны прызнаюць яго як легітымнага прэзідэнта, які вольны караць і міласаваць», — лічыць палітолаг.

А тым часам Беларусь трапіла ў чарговы «ваенны скандал». Вечарам 9 жніўня ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя, што Беларусь пастаўляе зброю тэрарыстычным групоўкам Tehrik-e-Taliban Pakistan (TTP) і Lashkar-e-Taiba (LeT), што базіруюцца ў Пакістане. Інфармацыю размясціла ў сетцы хакерская група Anonymous, «якая ўзламала серверы італьянскай кіберпаліцыі». Сцвярджаецца, што гэтыя невядомыя апублікавалі адсканаваныя дакументы, у якіх згадваюцца сума каля 20 мільёнаў еўра і кампанія «Белтэхэкспарт», аднак прадмет здзелкі не названы. Як сцвярджаюць аўтары публікацыі, пастаўкі зброі з Беларусі ажыццяўляюцца праз Сірыю і Курдыстан (этна-геаграфічная вобласць на тэрыторыі Турцыі, Ірана, Ірака і Сірыі), а фінансавыя аперацыі праводзяцца праз ліванскі банк Fransabank і іранскі банк Tejarat.

Як заявіў прадстаўнік Дзяржкамваенпрама па інфармацыі і сувязях з грамадскасцю Уладзімір Лаўранюк, з'яўленне чарговай публікацыі пра пастаўкі ўзбраенняў экстрэмісцкім арганізацыям у камітэце расцэньваюць як «сфабрыкаваную фальшыўку і наўмысную дэзінфармацыю».

Паводле яго слоў, у Беларусі створана нацыянальная сістэма экспартнага кантролю, якая адпавядае ўсім міжнародным стандартам. «Яна выключае якія-небудзь пастаўкі ўзбраенняў і ваенных тэхнікі ў абыход санкцыйных рашэнняў Савета бяспекі ААН», — сказаў Лаўранюк.

Ужо безліч разоў Беларусь вінавацілі ў пастаўках зброі. Усе гэтыя інфармацыйныя паведамленні з рэгулярнасцю абвяргаюцца беларускімі ўладамі. Але колькі ж можна апраўдвацца? Калі скандалы ўзнікаюць рэгулярна — можа, нешта за гэтым ёсць?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ



Цягам апошніх тыдняў у сістэме гандлю краіны назіраюцца праблемы з пастаўкамі мяса. Кошты на гэты прадукт узляцелі, да ўсяго і асартымент істотна зменшыўся. Праблема дэфіцыту мяса ў крамах Мінска паабяцаў вырашыць прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч. На пасяджэнні аператыўнага камітэта прэм'ер-міністр заявіў: «Ёсць варыянты рашэння, яны не патрабуюць вялікіх выдаткаў». Паводле яго словаў, ніякіх падставаў для ажыятажнага попыту на мяса цяпер няма.

«Ніякіх падставаў для турботаў і ажыятажнага попыту на свініну і мяса птушкі зусім няма, — сказаў кіраўнік урада. — Рэсурсаў дастаткова». Прэм'ер-міністр дадаў, што мясакамбінаты і гаспадаркі, вядома, сёння добра разумеюць, што прадаваць сваю прадукцыю на экспарт выгадна. «Аднак мы не павінныя забывацца на ўнутраны рынак», — падкрэсліў ён.

На мясакамбінатах падлічылі, што прадаваць свініну і ялавічыну айчынным крамам па ўстаноўленых цэнах цяпер вельмі не выгодна. Рэальныя даходы прыносіць экспарт. Аднак, калі праблему дэфіцыту мяса намерваецца вырашыць урад, то, магчыма, для забеспячэння сталічных крамаў у бліжэйшы час могуць увесці квоты на пастаўкі мяса. Гэта значыць, спачатку камбінат павінен паставіць пэўную колькасць мяса ў беларускія крамы і толькі потым займацца экспартам.

### ГАННА ШАДРЫНА



Былая намесніца галоўнага рэдактара газеты «Советская Белоруссия» Ганна Шадрына спрабуе праз суд дамагчыся выключэння свайго прозвішча з «чорнага спісу» неўязных у Еўрасаюз. Фармальна, яна звольнілася з газеты адміністрацыі Лукашэнкі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў і лічыць сябе недатычнай да фальсіфікацый і рэпрэсій у дачыненні да грамадзянскай супольнасці Беларусі.

Бюракратыя ЕС, як і належыць прававым дзяржавам, цяпер патрабуе ад кіраўнікоў дыпмісій еўрапейскіх краін у Мінску канкрэтных доказаў віны пакрыўджанай журналісткі.

«Даклад намі быў падрыхтаваны. У ім гаварылася, што Шадрына так і не папрасіла прабачэння за свае артыкулы ў «Советской Белоруссии», датычныя кандыдатаў у прэзідэнты ад апазіцыі і дэмакратычных актывістаў. І калі напісаных ёю асабіста артыкулаў было не так шмат, тым не менш яна з'яўлялася рэдактаркай іншых паклёпніцкіх матэрыялаў на адрас апазіцыі на старонках «Советской Белоруссии» — друкаванага органа адміністрацыі Лукашэнкі. З Брусэля прыйшоў адказ, што ў дакладзе недастаткова «доказаў віны» Шадрынай, і нам было даручана напісаць даклад зноў. На сёння падрыхтавана ўжо тры даклады», — цытуе крыніцу ў дыпламатычных колах рэсурс «Хартыя–97».

У ЕС ужо быў прэцэдэнт, калі жонку былога прэзідэнта Кот-д'Івуара Гбагбо суд апраўдаў і зняў забарону на яе ўезд у ЕЗ. Менавіта гэтым чыноўнікі тлумачаць сваю «прыдзірлівасць».

### КАРЫ ХЕЙКІЛЯ



Фінскі спецыяліст Кары Хейкіля стаў галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі. Бакі паставілі подпісы пад кантрактам, разлічаным на тры гады. Змяніць трэнера вырашылі пасля апошняга чэмпіянату свету, на якім Беларусь не мела поспеху (нацыянальная каманда заняла 14-е месца), і былога трэнера зборнай Эдуарда Занкаўца адправілі ў адстаўку.

Кары Хейкіля нарадзіўся ў горадзе Кангасала 10 студзеня 1960-га. Яго трэнерская кар'ера пачалася ў 1994 годзе ў шведскім клубе «Сундсваль». Настаўнік таксама працаваў са шведскім «Будзенам», фінскімі камандамі ХПК, «Ваасса спорт» і «Кярпят».

У 2004 годзе Хейкіля стаў першым фінскім трэнерам у чэмпіянаце Расіі. Спецыяліст трэніраваў яраслаўскі «Лакаматыў» у сезонах 2004/2005, 2007/2008, 2008/2009 і 2009/2010, а ў мінулым чэмпіянаце КХЛ трэніраваў магнітагорскі «Металург» і вывеў гэты клуб у фінал Усходняй канферэнцыі Кубка Гагарына.

Сярод трэнерскіх дасягненняў Хейкіля — срэбра (2003) і золата (2004) чэмпіянату Фінляндыі, бронза (2005) і срэбра (2008) чэмпіянату Расіі, а таксама срэбра чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі (2009).

«Мы задаволены тым, што нацыянальную каманду ўзначаліць такі аўтарытэтны спецыяліст, — адзначыў старшыня ФХРБ Яўген Ворсін. — Падпісанню кантракту папярэднічаў працяглы працэс, які завяршыўся ўзаемнымі дамоўленасцямі».

ЛЁСЫ

# З ДЗВЯРЭЙ ДОМА ЎРАДУ ФЁДАР ДАСТАЎ ШКЛО, КАБ НІХТО НЕ ПАРЭЗАЎСЯ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Палітвязню Фёдару Мірзаянаву ўсяго 20 гадоў. Хударлявы, у акулярах, ён спакойна і старанна даводзіць суддзі сваю пазіцыю. Быццам бы студэнт-выдатнік адказвае на іспыце. Якім чынам Фёдар Мірзаянаў апынуўся на Плошчы, як ён змяніў універсітэцкую лаву на лаву падсудных, у чым да лепшага перамянілі жыццё Фёдара снежаньскія падзеі — пра гэта мы гутарым з Людмілай Мірзаянавай, маці палітвязня.**



Усмешлівы Фёдар Мірзаянаў не губляе настрою і за кратамі

## Няздадзены іспыт

19 снежня Фёдар упершыню ўдзельнічаў у масавай вулічнай акцыі пратэсту. Хлопец прыйшоў на Плошчу са сваім лепшым сябрам Іллём Васілевічам (таксама асуджаным па справе пра «масавыя беспарадкі») падтрымаць тагачаснага кандыдата ў прэзідэнты Яраслава Раманчука. Як студэнту эканамічнага ўніверсітэта, Фёдару больш за ўсе іншыя імпанавала праграма эканаміста Раманчука.

Пытаюся ў спадарыні Людмілы, як яе сын, выдатнік прэстыжнага сталічнага ўніверсітэта, пераадолеў страх перад магчымым адлічэннем, арыштам і выйшаў на акцыю? «У гэтым няма нічога дзіўнага. У Фёдара даўно назапашвалася нейкае абурэнне, незадавальненне. Яшчэ ў 11 гадоў падчас адпачынку ў бабулі ў Нясвіжы ён за дзень да выбараў з сябрам панарабілі ўлёткі і раскідвалі іх па паштовых скрынях — гэта быў 2001 год. А ў 2006 годзе Федзя вельмі хацеў патрапіць на сустрэчу з Мілінкевічам. Ён разам з бацькам стаяў ля Дому афіцэраў, дзе Мілінкевіч сустракаўся з выбарцамі, і… не пайшоў — бацька яго адгаварыў», — распавядае Людміла Мірзаянава.

Ці пайсці на акцыю 19 снежня — Фёдар вырашаў самастойна. Пасля, адсядзеўшы 15 сутак адміністрацыйнага арышту, умудрыўся здаць чатыры залікі і тры іспыты. Апошні іспыт здаць не паспеў — зранку хлопца з хаты забралі супрацоўнікі МУС.

Людміла паказвае шматлікія дыпломы і граматы Фёдара за поспехі ў вучобе — іх столькі, што не змяшчаюцца на стале! Прызавыя месцы на алімпіядах па гісторыі, інфарматыцы, геаграфіі! З абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў Фёдар шмат разоў вяртаўся пераможцам у родныя Бранавічы. Напрыканцы ліпеня Фёдару зноўку выпала магчымасць пабыць на малой Радзіме. «Якое супадзенне: амаль суткі наш цягнік стаяў у Баранавічах!» — напісаў ён маці пра этапаванне ў калонію.

Гартаючы дыпломы, натыкаюся на падзячны ліст ад тагачаснага дэпутата парламента (цяперашняга намесніка гендырэктара «Мінск-Арэны» па ідэалагічнай працы) Мікалая Сергіенкі. Пафасны ліст аздоблены выявай Дома ўраду… Якое супадзенне!

## Крызіс веры ў правасуддзе

Гэты год скараціўся ў Фёдара на адзін дзень. «Ён выкрасліў гэтую дату са свайго жыцця. Федзя пра яе не ўзгадвае, не пазначае ў лістах», — гаворыць Людміла Мірзаянава. Не, не 19 снежня. Гэта 14 мая — дзень вынясення прысуду. Людміла называе гэты дзень «крызісам веры ў правасуддзе». Фёдар шчыра спадзяваўся на справядлівае рашэнне суда, да апошняга верыў, што суддзя яго пачуе. «Пасля адміністрацыйнага арышту, яшчэ напачатку студзеня, мы з мужам сур'ёзна пагутарылі з Федзем, заклікалі распавесці праўду — што ён рабіў на плошчы. Мы прасілі яго на ўсялякі выпадак з'ехаць з краіны. У нас ужо было дамоўлена з універсітэтам у Маскве, з двума ўніверсітэтамі ва Уфе (радзіма мужа, Рыма Мірзаянава), з універсітэтам у Паўднёва-Сахалінску. Але Фёдар сказаў, што шкло не біў, таму яму баяцца няма чаго», — узгадвае маці палітвязня.

Тое, што Фёдар не біў шкло, было засведчана нават на судзе. «Відэаздымка зафіксавала, як Фёдар падыходзіць да дзвярэй Дому ўраду, калі там ужо было выбіта ўсё шкло. З рамы дзвярэй тырчаў вялізны востры ашчэпак. Федзя яго дастаў і акуратна, спакойна паклаў на шафу, каб ніхто не забарыкадаваны ўваход у Дом ураду — каб ніхто не парэзаўся. Нават бачна, як ён падскочыў, каб дастаць да шафы — яна была высокая», — працягвае Людміла.

Пракуратура ж настойвала на тым, што Мірзаянаў тры разы кідаўся ашчэпкамі шкла ў міліцыянтаў. Суд адхіліў беспадстаўныя довады пракурора, з выніковага вердыкту гэтае абвінавачанне выключыў — і пакараў Фёдара трыма гадамі калоніі ўзмоцненага рэжыму. Пасля суду Фёдар яшчэ нейкі час пісаў абуральныя лісты маці, але з часам супакоіўся, пачаў ацэньваць падзеі саркастычна і нават дзякаваў лёсу за тое, што расплюшчыў яму вочы на беларускае правасуддзе.

## Інтэрнацыянальная салідарнасць

Калі беларусам і расійцам было наканавана калі-небудзь аб'яднацца ў саюз, дык гэта ў справе абароны Фёдара Мірзаянава. Два разы на месяц ягоныя сваякі і сябры праводзяць пікеты ля беларускага прадстаўніцтва ва Уфе. У адным з такіх пікетаў удзельнічаў нават прафесар Уфімскага дзяржаўнага авіяцыйнага тэхнічнага ўніверсітэта, доктар тэхнічных навук Міхаіл Верхатураў.

Беларусы не адстаюць. Фёдару шмат лістуюць, праўда, лісты нават з самымі нявіннымі словамі падтрымкі рэдка прабіваюцца праз цэнзуру. Складана перадаць і кнігі, якіх ужо накапілася некалькі дзясяткаў — падарункі ад знакамітых беларускіх пісьменнікаў і музыкаў. Свае аўтографы для Фёдара пакінулі Лявон Вольскі, Уладзімір Някляеў, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Арлоў і многія іншыя. Не забывае свайго выбарца і Аб'яднаная грамадзянская партыя, прадстаўнікі якой нават абяцалі падарыць ноўтбук для вучобы ў калоніі. Праўда, адміністрацыя калоніі забараняе перадаваць кампутар вязням — «не положено».

Людміла Мірзаянава са здзіўленнем распавядае пра ліст падтрымкі з Італіі: «У 2003 годзе Фёдара запрасілі ў склад журы на дзіцячы кінафестываль, які праходзіў у Італіі. І зараз, праз 8 гадоў, мы атрымалі ліст ад арганізатараў таго фестывалю са словамі падтрымкі Федзю і нам. Уяўляеце, яны самі нейкім чынам даведаліся пра зняволенне Фёдара і напісалі!»

Аднагрупнікі Фёдара таксама не забываюць свайго сябра і яго сям'ю, часта прыходзяць у госці да спадарыні Людмілы. Дарэчы, на момант напісання артыкула Фёдар Мірзаянаў яшчэ лічыўся студэнтам Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «эканамічная кібернетыка». Месяц таму маці Фёдара тэлефанавалі з адміністрацыі ўніверсітэта і прасілі, каб яе сын напісаў заяву пра адлічэнне па сваім жаданні. «Я перадала Федзю гэтую просьбу, але ён катэгарычна адмовіўся — маўляў, я паступіў з самым высокім балам, і няхай буду адлічацца? Няхай тады самі і адлічаюць», — перадае рэакцыю сына Людміла. Гэты выпадак унікальны, бо звычайна студэнтаў-«крымінальнікаў» адлічваюць з першых дзён завядзення справы.

У сваю чаргу Людміла Мірзаянава стараецца, як можа, падтрымаць іншых вязняў: «Я псіхолаг па адукацыі, дык пішу палітвязням парады, як адаптавацца ў новых умовах, як адшукаць радасць там, дзе яны зараз знаходзяцца. Я імкнуся падтрымаць іх душэўную раўнавагу, высокае меркаванне пра сябе — гэта вельмі важна, калі цябе ўвесь час спрабуюць прынізіць і растаптаць».

Спадарыня Людміла праводзіць мяне з катом Пушысцікам на руках — улюбёнцам Фёдара. У адным з апошніх лістоў Фёдар нагадаў, што ў Пушысціка хутка дзень народзінаў — маўляў, рыхтуйце кату свята! Віншаванняў непасрэдна ад свайго гаспадара Пушысціку давядзецца пачакаць, роўна як ягоным аднагрупнікам — займальных турыстычных вандровак, якія часта арганізаваў Фёдар, стосам новых кніг — свайго цікаўнага чытача, універсітэцкім лавам — свайго студэнта, усім нам — новага абаронцу Беларусі.



Людміла Мірзаянава клапатліва захоўвае для сына кнігі-падарункі ад беларускіх пісьменнікаў

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# З КАЛОНІІ — НА КАНЦЭРТ

Вольга ХВОІН

**У суботу, 13 жніўня, у сем'ях васьмі палітвязняў уздыхнулі з палёгкай. Дзмітрый Дрозд, Арцём Грыбкоў, Сяргей Казакоў, Васіль Парфянкоў, Яўген Сакрэт, Уладзімір Яроменак, Аляксандр Квяткевіч і Віталь Мацукевіч выйшлі на свабоду пасля памілавання.**





Фота аўтара

Сяргей Казакоў: да арышту і па выхадзе з калоніі

Андрэй Пратасеня, які мусіў бы таксама вярнуцца да родных, адмовіўся пісаць на імя Лукашэнкі прашэнне аб памілаванні, таму застаўся ў калоніі. Дзявятым памілаваным фігурантам крымінальнай справы па падзеях Плошчы стаў Уладзімір Хамічэнка. Яго паводзіны на Плошчы дагэтуль выклікаюць мноства пытанняў. Сірата, без сям'і, са спецыфічнай псіхікай, прагай да алкаголю, ён не быў у апазіцыйных партыях і рухах, але 19 снежня быў у ліку людзей, якія ламалі дзверы ў Дом урада. За два тыдні да прэзідэнцкіх выбараў Хамічэнка выйшаў з турмы.

Самым маладым сярод чарговай у гісторыі Беларусі хвалі палітвязняў быў Сяргей Казакоў — таленавіты музыка-самавук, якому ўжо ў следчым ізалятары споўнілася 19 гадоў. Турма стала яго першым суровым універсітэтам жыцця. Пра юнака расказвалі як пра рамантычнага і адкрытага чалавека. Паўгады за кратамі дадалі суму і асцярожнасці позірку, але, спадзяюся, не злосці яго душы.

Сяргей быў актывістам кампаніі «Еўрапейская Беларусь». 27 студзеня хлопца забралі з працы. На свабодзе ён апынуўся толькі праз паўгады. На якіх умовах Сяргею абяцалі «дапамагчы» вызваліцца і як пісалася прашэнне аб памілаванні — пра гэта мы і гутарылі з былым палітвязнем.

— Мяне выклікалі ў РАУС на гутарку — мой мабільны тэлефон «засвяціўся» 19-га на плошчы Незалежнасці. Але я не разлічваў, што гэта скончыцца трыма гадамі прысуду. Пра ад'езд з краіны сур'ёзна не думаў — чаму з-за некага я мушу з'язджаць? Я ў сваёй краіне і ў межах закона магу рабіць усё, што заўгодна. Ад 2008 года я — актывіст кампаніі «Еўрапейская Беларусь». Проста з імі першымі сустрэўся. У 2008 годзе знаёмы папрасіў пазбіраць подпісы за чалавека, які балатаваўся ў парламент. Пахадзіў па кватэрах, паразмаўляў з людзьмі і зразумеў, што ў нас нешта не так, трэба нешта мяняць. Мяне ніхто не агітаваў, а сам папрасіўся да актывістаў «Еўрапейскай Беларусі».

***— Што ты думаеш зараз, праз паўгады пасля выбараў?***

— Зразумела, ніякіх думак, што трэба ісці штурмаваць Дом ураду ў мяне не было. Ды і ні ў кага такіх планаў не было. Мне ў віну інкрымінавалі «удар па шчытах амапаўцаў» і «спробу прарваць ланцужок АМАПу». Магу пацвердзіць — так, па шчытах біў. Шчыты загароджвалі Дом урада, шкло ў дзвярах на той момант ужо было разбітае. Магу сказаць, што гэта рабіў не пад уплывам натоўпу. Бо, калі білі шкло, не ўзнікла ж парыву пайсці і «дапамагчы». Хутчэй гэта была рэакцыя на першыя дзеянні АМАПу. Нікому не прыемна атрымаць ні за што дубінкай па лбу. Прыгадаю момант, як пачалі біць шкло: стаялі людзі побач з Домам урада, адначасова з некалькіх бакоў выбеглі невядомыя і пачалі біць вокны ў дзвярах, ім крычалі: «Правакацыя!», але гэта не спыніла. Мяркую, калі б АМАП хацеў гэтаму перашкодзіць, то адцясніў бы людзей ад дзвярэй ад спачатку. І яшчэ: у мяне на судзе былі сведкі-жанчыны, якія расказалі, што прыйшлі на плошчу Незалежнасці яшчэ да таго, як туды падышоў натоўп, і бачылі: нейкі чалавек біў лёгенька па шклу малатком, пайшлі трэшчыны. Шкло ў дзвярах Дома ўраду тоўстае, і так проста яго не паб'еш. Побач з гэтым невядомым стаялі людзі ў цывільным і ніяк яму не перашкаджалі. Гэтыя акалічнасці наводзяць на думку, што ўсё было сапланавана загадзя. Наконт прарыву ланцуга АМАПу не ведаю, як і хто гэта прыдумаў. Яшчэ больш цікава, якім чынам гэта даказалі. Але зразумела, што ў нас штосьці даказваць не абавязкова.

***— Як развіваліся падзеі пасля арышту, ці быў страх?***

— Не магу сказаць, што нечага я моцна баяўся. На Валадарцы першым прыйшоў, як я зразумеў, супрацоўнік КДБ. Без запісу, пратаколаў пачаў задаваць пытанні наконт маёй дзейнасці, паказваць фотаздымкі, пытацца, каго я пазнаю. Гаварыў: «Ты нам дапаможаш, мы пастараемся нешта зрабіць, выйдзеш пад падпіску». Але я ведаў: яны здольныя наабяцаць што заўгодна. Пасля кадэбіста мне адразу прад'явілі абвінавачванне. Потым прыязджаў аператыўнік, які мяне затрымліваў, зноў задаваў падобныя пытанні без пратаколу. Вось з гэтага часу і пачалася мая «адсідка». Цікавая гісторыя была з камерамі. Спачатку пасадзілі ў камеру, дзе знаходзіліся дваццаць чалавек. Праз тры дні перавялі ў «чацвёрку», але там быў толькі адзін чалавек. І літаральна за тры хвіліны да майго «засялення» адтуль перавялі Паўла Вінаградава. СІЗА на Валадарскага заўжды перапоўнены, таму мяне збянтэжыў гэты факт. Час ішоў вельмі павольна, мне было зразумела, што трэба ўвесь час сачыць за тым, што гавару свайму суседу. Праз тры тыдні мяне перавялі ў звычайную камеру, і там я даведаўся, што пасадзілі Парфянкова. Усё стала зразумела.

Недзе я спадзяваўся на лепшае, але маральна быў гатовы, рыхтаваўся да горшага. І нават мой адвакат сказала... Усе дарослыя людзі, усе ўсё разумеюць. Да турэмнага тэрміну немагчыма рыхтавацца, з гэтым можна толькі змірыцца, знайсці хоць нейкія плюсы. Напрыклад, чытаць кнігі, на якія не хапала часу, заняцца спортам. Турма — гэта вялізны жыццёвы досвед, і не такі вялікі збор адмарозкаў і бандытаў, якія толькі і думаць, як каму зрабіць брыдасць. Там многа культурных, адукаваных людзей, з якімі проста цікава пагаварыць. На Валадарцы было многа бізнэсмэнаў, дырэктараў. Палова з тых, хто «заязджаў», — па эканамічных артыкулах. Былі дзеячы мастацтва, але яны часцей, я так зразумеў, сядзяць за наркотыкі.

***— Як змянілі цябе гэтыя шэсць месяцаў?***

— Менш давяраць людзям, напэўна, я не магу, бо давер закладзены з дзяцінства. Але цяпер многае залежыць ад таго, што ў мяне будзе прасіць чалавек, што ён будзе гаварыць. Зразумела, нельга верыць усяму і ўсім, але і станавіцца закрытым таксама. Не ўсе людзі свінні.

***— Вязні да цябе, тваёй справы ставіліся з разуменнем?***

— У турме чытаюць акуратпакі незалежную прэсу. «Советскую Белоруссию» выпісваюць, але ніхто яе не чытае. Тое, што адбываецца на свабодзе, цікавіць вязняў хаця б таму, што яны пазбаўленыя гэтага. Хваляюцца за сваіх родных, якія часам не могуць сабраць нават адну перадачу раз на чатыры месяцы. У калоніі ўсе ведалі пра маю справу. Многія падтрымлівалі, нехта быў абыякавы, але я не сустрэў ніводнага чалавека, якія былі бы прыхільнікам дзейснага рэжыму.

***— Пасля 19 снежня была моцная хваля салідарнасці, людзі самаарганізоўваліся — пісалі лісты, неслі вязням перадачы. Ці адчуў ты гэта на сабе?***

— Спачатку перадачы былі толькі ад мамы, лісты пісалі таксама толькі блізкія людзі. Падтрымка знешняя з'явілася бліжэй да суду — пачалі прыходзіць лісты, паштоўкі ад незнаёмых людзей. Калі прыехаў у Бабруйскую калонію, то часам у дзень прыходзіла па шэсць-сем лістоў. Гэтая падтрымка неацэнная, бо такія пасланні давалі зразумець, што я сяджу не дарэмна. З'явілася жаданне змагацца далей.

***— То бок на шлях выпраўлення ты не стаў?***

— Не думаю, што нашая турма здольная некага выправіць. Калі чалавек злодзей, то злодзеем і застанецца з такімі метадамі выпраўлення. Гэтым пытаннем я задаваўся ўсе дні, калі проста сядзеў там на лаўцы. Людзей заганяюць у агароджаную тэрыторыю, ёсць абмежаванні ў кантактах, дабротах жыцця. Але хіба гэта метад выпраўлення?

***— Ці чакаў свайго вызвалення праз памілаванне?***

— Часам я быў абсалютна ўпэўнены, што мы выходзім з калоніі. Часам наадварот — усё страчана. Але рыхтаваў сябе да горшага: што давядзецца адседзець увесь тэрмін. І ўсё ж я верыў — гэта адбудзецца. Хіба што не думаў, што вось так хутка.

***— Як адбывалася падпісанне хадайніцтва аб памілаванні?***

— Нейкі чалавек, што прадставіўся супрацоўнікам Магілёўскага дэпартаменту выканання пакаранняў, спачатку размаўляў мякка. Маўляў, хочаш пабачыць сясцёр, маму? Я не адразу пагадзіўся. Потым пачаўся больш жорсткі ціск, нават з элементамі пагроз. У выніку сышліся на кампрамісе. Я так разумею, што ім была патрэбная сама паперка. Што там было напісана — няважна. Гэты чалавек з Дэпартаменту дыктаваў, кароткі змест хадайніцтва такі: прашу прымяніць да мяне артыкул аб памілаванні і кароткія звесткі пра сябе. Для памілавання мусяць быць важкія прычыны — ветэран вайны, шматдзетны бацька. У мяне не было ніякіх важкіх прычынаў. Усё было фармальна, проста трэба было напісаць паперу.

***— Якое было стаўленне да цябе супрацоўнікаў пенітэнцыярнай сістэмы?***

— З супрацоўнікамі СІЗА перакрыжоўваешся рэдка, бо ўвесь дзень сядзіш у камеры. Але магу сказаць, што мінскія супрацоўнікі ставіліся даволі мякка. Ішлі на кантакт. Ад іх я даведаўся і пра акцыю «Стоп-бензін». У Бабруйскай калоніі, відаць, выпрацаваны нейкі план паводзінаў, бо там ужо былі «палітычныя» — Андрэй Кім, Юрый Лявонаў. Рэгулярна да мяне прыходзілі супрацоўнікі калоніі, вялі нейкія прафілактычныя размовы, абяцалі адправіць працаваць на дальні ўчастак, каб ніхто мяне не бачыў. Я цікавіўся наконт творчасці, самадзейнасці, але мне адразу сказалі: «Цябе мы не пусцім». Не ведаю, можа, баяліся, што я са сцягам буду хадзіць па атраду. Нават праскоквала фраза: «Не весці размоў на палітычныя тэмы». Але як гэта было магчыма, калі людзі падыходзілі і прасілі расказаць, што было на Плошчы?

Што мне дакладна не спадабалася, гэта два месяцы ў каранціне — курс маладога байца ўнутры «зоны». Каранцін там адгароджаны ад усёй «зоны» бетонным плотам, за два тыдні вязні праходзяць медагляд, ім робяць бэджы, чытаюць пару лекцый наконт умоў для змены рэжыму на больш мяккі. Галоўны мінус каранціна — дзіўны рэжым дня. Увесь час, апроч трох прыёмаў ежы і двух гадзін вольнага часу, трэба знаходзіцца на вуліцы. Не важна, якое было надвор'е. Калі ліло як з вядра, то можна было зайсці пастаяць у тамбур перад дзвярыма. Але туды набіваліся пяцьдзесят чалавек, самі разумееце, нязручна. Даходзіла да таго, што нават у прыбіральню немагчыма было схадзіць. Нельга было здымаць турэмную робу, як бы спякотна ні было. На пяцьдзесят чалавек — два ўмывальнікі, ранкам і вечарам адводзілася паўгадзіны на гігіену. Нават зубы пачысціць усе не паспяваюць.

***— Ёсць разуменне, як далей будаваць сваё жыццё?***

— Трэба вучыцца, але, відаць, буду гэта рабіць ужо не ў нас. Прайшло паўгады, не так і шмат часу, але многае вельмі змянілася. Былі іншыя планы. У сям'і ўсё як раней, хіба што сёстры падраслі. Трапляеш у турму, і праз пару месяцаў пачынаеш фільтраваць кола знаёмых. Самае страшнае звычайна бывае пасля суда — сыходзяць жонкі, забываюць сябры. Яшчэ горш, калі гэта адбываецца да суда. У маім акружэнні таксама ёсць людзі, якія ўмудрыліся паставіць крыж. Нічога не зробіш, так бывае. Падтрымлівалі тыя, з кім я бачыўся раз на паўгода ці на некалькі месяцаў, каго бачыў хіба што аднойчы ў жыцці. Але, можа, яно і да лепшага. Я ведаю, што засталіся надзейныя, і я таксама буду заўжды гатовы ім дапамагчы.

Канешне, буду працягваць займацца музыкай. Я трацію на музыку сродкі, сілы, і не кіну гэты занятак. У суботу мяне выпусцілі з калоніі, а ў нядзелю я ўжо быў на рэпетыцыі нашага гурта «Скрыжалі». І другога верасня будзе канцэрт.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# КАБ ВАМ ТАК ЗУБЫ РВАЛІ...



**Кіраўнік Камітэта дзяржкантролю Аляксандр Якабсон тлумачыць, што кошты на спажывецкія тавары будуць падвышацца да ўзроўню расійскіх і ўкраінскіх. Але абяцае падвышэнне заробкаў. Да гэтага зводзіцца сэнс заявы, зробленай ім на сустрэчы з працоўным калектывам СВК «Маяк Браслаўскі».**

Па словах Якабсона, так робіцца з-за таго, што «з прадуктамі вывозіцца бюджэт краіны, бо вытворчасць малака і мяса ў краіне датуецца з бюджэту».

Зразумела, на тое і дзяржкантроль, каб ратаваць бюджэт ад рабавання. І бароняць. Прыкладам, яшчэ тры месяцы таму можна было купіць нейкую кілбасу за 15 тысяч, а сёння яна ўжо каштуе 35 тысяч за кілаграм. Раней бюджэт табе аддаваў, а зараз ты — бюджэту. Увогуле, свіныя кілбасы, добрае мяса, вяндліна ды іншае падвысіліся коштам да 10–12 долараў за кілаграм. Розны лівер каштуе па 2–3 долары, косткі таксама. Вось і падлічыце, колькі грошай прынясе перапрацоўка адпраўленага на бойню падсвінка вагой у 6–8 пудоў. Атрымоўваецца каля 600–700 долараў з адной галавы. Гэта значыць 2–2,5 «чыстыя» сярэднія зарплаты.

Нічога сабе кошты! А кажуць, таннае… Лепш увогуле ў краму не хадзіць...

Але гэту відавочную ісціну не бачыць Якабсон. Яму хочацца, каб людзі ўвогуле забыліся, як пахне свежая кілбаса або вяндліна. Бо ён лічыць, што рост коштаў на асноўныя (а якія не асноўныя — лебяда, чырвоная ды чорная ікра, амары?) віды харчавання і падвышэнне іх да ўзроўню расійскіх непазбежныя. «Людзям трэба разумець, у нас іншага шляху няма: неабходна ўраўняць кошты да ўзроўню сумежных рэгіёнаў, аднак рыўкоў не павінна быць. Паступова, па 3–5% у месяц».

Каб вам так зубы рвалі...

Спадар Якабсон патлумачыў, што трэба і заробкі падвышаць. Але, у адрозненні ад коштаў, не зверху, а знізу. Гэта значыць, каб кожны лепей працаваў, падвышаў прадукцыйнасць працы, выдаткоўваў меней рэсурсаў на тliving адзінку і гэтак далей. А як быць урачам, настаўнікам, пажарнікам? Падпальваць дамы блізу дэпо, каб недалёка ездзіць і эканоміць паліва?

Як нагавораць нашы адказныя асобы — ні п'янаму зразумець, ні цвярозаму разабрацца. Хоць бы дамаўляліся, каму, калі і што казаць. Бо Якабсон намякае на падвышэнне заробкаў (да расійскіх памераў, інакш навошта нам ваша мудрае кіраўніцтва?), а прэм'ер-міністр Мясніковіч кажа, што да канца года стаўка першага разраду не падвысіцца. Гэта значыць, што будзе замарожана заробатная плата ўсіх працаўнікоў. Ад прыбіральшчыц да работнікаў найвышэйшай кваліфікацыі. Гэта прывядзе да непазбежнага скарачэння плацежаздольнага спажывецкага попыту, і таму прадпрыемствы папросту затаварацца. Няма каму будзе купляць тыя ўсе прысмакі, якія вырабяць сельгаспадарнікі і харчавікі ў колькасці большай за мінулагоднюю. Яны ў нас так прызвычаіліся, што з кожным годам выпрабляюць і болей кілбас, і мёду, і кісялёў розных.

Але якая карысць з таго, калі мы сягата спажыць не зможам?

Дык што цяпер, і ў Расію не прадаваць?

У 1998 годзе А.Г. загадаў, каб яек у гандлі хапала ўсім і па даступных, сацыяльна-справядлівых коштах. Але «справядлівасць» для спажыўца прыводзіць да стратаў вытворцаў — вытворчасць скарачаецца. У выніку справядлівасць ёсць, яек няма. Ад раскачвання на арэлях «справядлівасці» ў Лукашэнкі закруцілася ў галаве, і ён загадаў у студзені 1999 года адпусціць кошты на яйкі на свабоду. Вось тут і заявіў пра сябе плацежаздольны пакупніцкі попыт: ужо ў канцы лютага 2000-га гандаль затаварыўся, назапасіўшы 18 мільёнаў яек. Быццам бы і няшмат, па 1,8 яйка на душу насельніцтва, але атрымоўвалася, што коштам гэтых 1,5–2 яек вымяраўся ўзровень жыцця сярэдняга беларуса.

Адтуль і пайшло знакамітае «схапіўся за яйкі — прапала малако».

Здаецца, што чыноўнікі абыякава ставяцца не толькі да эканомікі як навукі, але не аналізуюць нават уласны досвед мінулых гадоў. Прыкладам, той жа Якабсон, калі быў старшынёй Гомельскага аблвыканкама, біў трывогу, што прадукты харчавання ў Беларусі каштуюць нашмат болей, чым ва Украіне. Па мясу — ад 40 да 200%, па кілбасах — у два разы, па макаронных вырабах — у 2,7 разы і гэтак далей. А прамысловыя тавары, узятыя агулам, ва Украіне каштавалі ў два разы танней, чым у Беларусі.

Па дадзеных памежнай службы, за 2008 год больш за 4 мільёны беларусаў зрабілі шоп-туры ва Украіну, заплаціўшы за таннае ўкраінскае харчаванне ды іншы «шырспажыў» блізу 1,2 мільярда долараў. І там у званы не білі. Не патрабавалі падвышэння коштаў, каб не вывозілі харчаванне беларусы. А Якабсон турбаваўся, бо людзі з Гомельшчыны кідалі працу ў калгасах і ехалі ў Чарнігаў, каб там атаварыцца на цэлы год.

Тады ён лічыў, што кошты на беларускае сала трэба зменшаць. Бо вывозяць грошы...

МЕРКАВАННЕ

# БЕЛАРУСКАЯ МАДЭЛЬ

## МЫШ ЗРАБІЛАСЯ ПАЦУКОМ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ




**Калі падвышаць эфектыўнасць эканомікі, то следам падвысяцца прыбыткі прадпрыемстваў, заробкі працоўных і падатковыя адлічэнні ў бюджэты розных узроўняў. Звычайна так і робіцца ў краінах, якія маюць доўгатэрміновую стратэгію дасягнення ўстойлівага развіцця. Эканомікі такіх краін растуць не вельмі хутка, але стабільна. Адпаведна, растуць набыткі фірмаў ды хатніх гаспадарак, і, як наступства, пашыраецца ўнутраны попыт на тавары і паслугі.**

У такіх дзяржавах звычайна напоўніцу працуе інстытут сацыяльнага партнёрства, які выпрацоўвае доўгатэрміновыя пагадненні паміж працадаўцамі і працаўнікамі наконт тарыфаў заробатнай платы і прыбыткаў карпарацый. Дзяржава пры гэтым выконвае ролю аб'ектыўнага суддзі і прымае на сябе абавязкі па захаванні пэўных макраэканамічных паказнікаў, парушэнне якіх зробіць немагчымым дасягненне мэтаў хатніх гаспадарак і прадпрымальнікаў.

Але зусім не так робіцца ў Беларусі. Улада не лічыцца ні з саюзамі працадаўцаў, ні з прафесійнымі саюзамі. А над працоўнымі ўвогуле праводзіць розныя эксперыменты. І ўсім робіць прапановы, ад якіх тыя не могуць адмовіцца. Адным падвышаюць заробкі, іншым — падаткі, а трэціх пераводзяць на дзяржзабеспячэнне па еўрапейскіх стандартах. І вось за год заробкі падвысіліся ў 1,4 разы. А прадукцыйнасць працы ці засталася ранейшай, ці нават зменшылася. А папяровых грошай, на якія можна купіць тавары, стала болей.

Але галоўная крыніца пашырэння ўнутранага попыту — гэта выдача крэдытаў усім дзяржаўным ці прыватным прадпрыемствам, што апякуюцца ўрадам ды выконваюць розныя яго праграмы, якія ніколі не акупяцца. І таму гэтыя арганізацыі ці не маюць магчымасці, ці нават і не збіраюцца тыя крэдыты выплочваць.

Гэта грошы нагоды на самай справе пустыя, не забяспечаныя ні адпаведнай таварнай масай, ні наборам платных паслуг, ні валютнымі запасамі. Але за іх усё можна купіць. Перш-наперш валюту, бо колькі б ні пісала «Советская Белоруссия» пра хуткі крах фінансавай сістэмы Злучаных Штатаў, долар ніколі не звальвецца ў штопар, як гэта звычайна робіць беларускі рубель.

З гэтай нагоды насельніцтва скупіла за «лішнія» рублі ўсю наяўную валюту, што мелася ў банках. Інакш кажучы, зрабіла банкам прапанову, ад якой тыя не змаглі адмовіцца.

Таму ў банках ад долара застаўся толькі афіцыйны курс, а сама грашовая адзінка скіравалася на чорны валютны рынак. Нічога новага, так ужо было ў 1990-я гады. Але ж гэта было даўно, здавалася, што ўдалося выратавацца. І быццам бы беларуская мадэль, пра якую было сказана рознымі недзяржаўнымі экспертамі шмат дрэннага, закруцілася, набрала хуткасць і панеслася да вяршынь. Але замест вяршынь пад нагамі адкрылася бездань.

За што змагаліся, на тое і нарваліся… Прапаную параўнаць некалькі лічбаў. У 1994 годзе памер знешняга гандлю складаў 18,6 млрд. рублёў: экспарт — 9,3, імпарт — 9,325 мільярда. Адмоўнае сальда раўнялася 25 млн. рублёў. Дэфіцыт знешняга гандлю складаў толькі 0,1% ад памеру агульнага тавараабароту.

З краінамі далёкага замежжа тавараабарот складаў 6,5 млрд. долараў: экспарт — 3,9, імпарт — 2,6. Сальда дадатнае — 1,3 мільярды, або 20% агульнага тавараабароту. Вось такая была эфектыўнасць знешняга гандлю. І нікому не магло прыйсці ў галаву абмежаваць імпарт спажывецкіх тавараў, бо дзякуючы «чаўнакам» упершыню за дзесяцігоддзі прапанова на ўнутраным рынку пачала перавышаць попыт.

З краінамі СНД тавараабарот складаў 12,1 млрд. рублёў: экспарт — 5,4, імпарт — 6,7 млрд. Адмоўнае сальда — 1,325 млрд. рублёў, або 11% ад агульнага тавараабароту. Вось такая эфектыўнасць партнёрскіх брацкіх стасункаў.

Такім чынам, каб кампенсаваць страты ад гандлю з былымі саюзнымі рэспублікамі, прыбыткаў, атрыманых на Захадзе, крыку не хапіла.

Лукашэнка і зараз ахвотна ўспамінае пра мярзотны стан эканомікі, якая яму дасталася ў спадчыну ад Кебіча.

Але яму засталася і галоўная праблема — дыверсіфікацыя знешняга гандлю, коштам змяншэння ўдзельнай вагі СНД, перш-наперш Расіі, і падвышэння долі астатняга свету.

А як зараз? За паўгода тавараабарот склаў 40,1 млрд. долараў: экспарт — 18,2, імпарт — 22,6. Адмоўнае сальда — 4,4 млрд. долараў, або 11% ад агульнага аб'ёму тавараабароту.

З далёкім замежжам тавараабарот склаў 19,2 млрд. долараў: экспарт — 9,5, імпарт — 9,8. Адмоўнае сальда — 300 мільёнаў, або 0,15% ад агульнага тавараабароту.

У гандлі з краінамі СНД тавараабарот склаў 21,7 млрд. долараў: экспарт — 8,8, імпарт — 12,9. Адмоўнае сальда склалася ў памеры 4,1 мільярда, або 19% ад агульнага тавараабароту.

У эканоміцы, аб чым сведчаць дадзеныя знешняга гандлю, прынцыпова нічога не змянілася. Яна засталася эканомікай, галоўным таварам якой застаецца рэсурсны дэфіцыт, што па абставінах набывае валютны выгляд.

Змены колькасныя. Быццам мыш вырасла ў вялізарнага пацука. Была істота жвавай і маленькай, зрабілася вялікай і рахітычнай.

На ўнутраным рынку ўрад можа рабіць амаль усё, што захоча. Нават цалкам закрыць яго для спажывецкага імпарту. Але на знешніх рынках можна прадаваць толькі тое, што бяруць, і па тых коштах, якія даюць.

Большасць эканамічных суб'ектаў не могуць так перапрацоўваць сыравіну, выкарыстоўваць энергарэсурсы, камплектуючыя, каб прадаць на знешнім рынку гатовую прадукцыю па цане, якая перавышае вытворчыя выдаткі.

Прыкладам, у мінулым годзе ў Беларусь было ўвезена прамежкавых тавараў (энерганосьбіты, сыравіна, матэрыялы і камплектуючыя) на суму 25,4 млрд. долараў (плюс 22% да 2009 года), а экспартавана — на суму 16,4 млрд. долараў (плюс 9,2%). Такім чынам, адмоўнае сальда ў гандлі прамысловымі рэсурсамі дасягнула 9 млрд. долараў і падвысілася адносна 2009 года на 3,2 млрд. долараў. На мільярд болей, чым у гандлі таварамі ў цэлым.

Вось тут галоўная праблема, да вырашэння якой, падобна на тое, і падступіліся. Валютны дэфіцыт здарыўся не таму, што людзі за свае грошы куплялі аўтамабілі ды іншае напярэдадні падвышэння мытаў. Па распараджэнню, дарэчы, урада. А таму, што эканоміка расце ў памерах і не змяняецца якасна.

Пры такім раскладзе нічога не зменіцца нават тады, калі нам забароняць купляць імпартную туалетную паперу. Скажуць, у Шклове ёсць газетная.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 22 ЖНІЎНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь.
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Дакументальны серыял «Гараджане-2011»: Лісабон.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** «Сястрычка». Меладрама (Расія).
**13.50** Сінематэка.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Сямейная фантастычная камедыя «Прышэльцы на гарышчы» (ЗША - Канада).
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Арэна.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Камандзіроўка.
**21.55** Крымінальны баявік «Не памірай у адзіночку» (ЗША).
**23.50** Дзень спорту.
**00.00** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Таямніцы патанулых караблёў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрана». Серыял.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Апошняя сустрэча». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Шматсер. фільм «У лясах і на гарах».
**23.05** Тэорыя неверагоднасці.
**23.50** «Хай кажуць».
**00.45** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011 - кастынг.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**14.45** Красуні! Міс-Мінск-2011 - кастынг.
**14.55** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** «Я-вандроўца».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Алігарх». Расія-Германія-Францыя, 2002 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету».

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Дэтэктыў «Жураў-2» (Расія).
**10.10** Жансавет.
**10.45** Канцэрт Phil Collins. Finally.. The First Farewell Tour.
**12.50** «Лабірынты мастацкай культуры Заходняй Беларусі». Частка 1-я.
**13.20** Камедыя «Воблака 9» (ЗША).
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў-2» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25, 23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Юнайтэд-Тотэнхем. Прамая трансляцыя.
**00.20** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Прамы эфір».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Неўзаемнае каханне. Рыма Казакова». Дакументальны фільм.
**13.50, 16.50, 19.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Пятая група крыві».
**22.10** Дэтэктыўны серыял «Таемная варта. Смяротныя гульні».
**23.05** КВЗ. Першая ліга. Лепшае.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі.ru».
**23.50** «Чырвоная Месаліна. Дэкрэт аб сэксе». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 20.05** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.05** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Прэм'ера. Серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.35** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Адплата».
**21.15** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.30** Серыял «Справа Крапівіных».
**00.25** Серыял «Крымінальнае відэа».

### EUROSPORT

**09.30** Мотаспартыўны часопіс.
**09.45, 16.00** Велаcпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 2-і этап.
**11.00, 15.00** Вяславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету на гладкай вадзе (Сегед, Венгрыя).
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 108 (Хінтэрцартэн, Германія).
**13.30, 19.00** Скачкі ў ваду са скалы. Сусветная серыя (Чылі).
**14.00** Тэніс. Турнір WTA (Цынцынаці, ЗША). Фінал.
**17.00, 01.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 3-і этап.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.30** Футбол. Кубак свету да 20 гадоў. Матч за 3-е месца. Калумбія.
**20.30** Футбол. Кубак свету да 20 гадоў. Калумбія. Фінал.
**21.45** Вось дык так!!.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**23.45** Футбол. Кубак свету да 20 гадоў. Калумбія. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** «Праведнікі», тэлесерыял: 4 серыя.
**08.30, 14.40, 18.15** «Дамова з Гітлерам», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.25** Басанож па свеце.
**09.50, 15.35** На колах.
**10.20, 16.40** Прыватная калекцыя.
**10.35** Без рэтушы: «Вяртанне Памяці», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**11.00** МакраФон: «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 2.
**11.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.40** Размовы эксперта.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Удзельнікі турпаездкі», камедыя, 2006 г., Чэхія.
**13.50** «Праведнікі», тэлесерыял: 4 серыя.
**16.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.15** Размовы эксперта.
**16.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 38 серыя.
**17.30** «Праведнікі», тэлесерыял: 4 серыя.
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.40** Размовы эксперта.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Героі не нашага часу: «Зінаіда Бандарэнка».
**21.45** «Удзельнікі турпаездкі», камедыя, 2006 г., Чэхія.
**23.25** Аб'ектыў.

## 23 ЖНІЎНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь.
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Камандзіроўка.
**12.10** Меладрама «Іншы твар».
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.35** Ведай нашых:.
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Матч плэй-офф. Прамая трансляцыя.
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**00.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Матч плэй-офф.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 19.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Таямніцы патанулых караблёў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрана». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Апошняя сустрэча». Шматсер. фільм.
**22.10** Шматсер. фільм «У лясах і на гарах».
**23.05** «Пятля для горада».
**00.00** «Хай кажуць».
**00.55** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Алігарх». Расія-Германія-Францыя, 2002 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Сомэрсбі». ЗША - Францыя.
**15.50** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Крамень». Расія, 2007 г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойная сіла 5». Серыял.
**00.15** «Водбліскі». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Жураў-2» (Расія).
**10.10** Жансавет.
**10.40** Канцэрт Diana Krall «Live in Rio» (ЗША).
**12.45** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.30** «Лабірынты мастацкай культуры Заходняй Беларусі». Частка 2-я.
**14.00** Баявік «Паршывыя авечкі» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў-2» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт Diana Krall «Live in Rio» (ЗША).
**23.25** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**00.10** Спорт-кадр.
**00.40** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Жаночы твар вайны. «Кацюша». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пятая група крыві».
**13.50, 16.50, 19.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Пятая група крыві».
**22.10** Дэтэктыўны серыял «Таемная варта. Смяротныя гульні».
**23.05** КВЗ. Першая ліга. Лепшае.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі.ru».
**23.50** «Бомба для спевака. Уладзімір Мігуля». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.35** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Адплата».
**21.15** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.05** Сёння.
**23.30** Серыял «Справа Крапівіных».
**00.25** Серыял «Крымінальнае відэа».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 3-і этап.
**10.30** Футбол. Кубак свету да 20 гадоў. Калумбія. Фінал.
**11.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 108 (Хінтэрцартэн, Германія).
**13.30** Скачкі ў ваду са скалы. Сусветная серыя (Мексіка).
**14.00** Футбол. Кубак свету да 20 гадоў. Калумбія. Фінал.
**15.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 3-і этап.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 4-ы этап.
**18.45** Скачкі ў ваду са скалы. Сусветная серыя (Мексіка).
**19.15** Футбол. Кубак свету да 20 гадоў. Калумбія. Фінал.
**20.30** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**21.00** Бокс. ЗША.
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак. ЗША.
**00.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Сільверстоун, Вялікабрытанія). Агляд.
**00.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 4-ы этап.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Побач з намі.
**07.40** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 38 серыя.
**08.10** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**08.25** Героі не нашага часу: «Зінаіда Бандарэнка».
**08.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.10** «Тата», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**11.00** «Ранча», серыял: 37 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дамова з Гітлерам», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**13.00** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 38 серыя.
**13.25** Форум (ток-шоу): «Уласнасць як аснова дэмакратыі».
**14.05** Еўропа сёння.
**14.35** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**14.50** «Тата», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**16.40** Героі не нашага часу: «Зінаіда Бандарэнка».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 39 серыя.
**17.30** «Арол», серыял: 4 серыя.
**18.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Невядомы і блізкі. Каталіцкі касцёл у Беларусі», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**20.10** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.15** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.45** Невядомая Беларусь: «Курапаты – шлях сумлення», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**22.15** «Дэтэрмінатар», серыял: 8 серыя.
**23.00** Аб'ектыў.

## 26 ЖНІЎНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь.
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Містычны трылер «Празорлівая» (Расія).
**14.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў» (Расія).
**16.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**18.40** Ведай нашых.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Песні мора». Музычны фэст.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Таямніцы патанулых караблёў».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «ДО РЭ». Лепшае.
**22.50** Прэм'ера. Фільм «Жыць».
**01.25** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**09.00** Фільм «Легенда». ЗША- Вялікабрытанія, 1985 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 5». Серыял.
**15.40** «Жаданая». Серыял.
**16.50** «Я-вандроўца».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Знаёмства са спартанцамі». ЗША, 2008 г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Фільм «Ператварэнне». Расія, 2002 г.
**00.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Школьная камедыя «Як я быў вундэркіндам». 1-я і 2-я серыі.
**11.30** Кожны мае права быць розным.
**11.55** «Папая». Дак. фільм (НГТРК).
**12.30** Час футболу.
**13.25** Рэальны свет.
**14.00** Баявік «Паршывыя авечкі» (Расія-Украіна). 4-я серыя.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** «Адна ноч» (Беларусь).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыя «Як Майк» (ЗША).
**20.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Суперкубак Еўропы. Барселона-Порту. Прамая трансляцыя.
**23.40** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**00.20** Дыялогі аб рыбалцы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пятая група крыві».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля - 2011».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.15** Фільм «Шукаю цябе». 2010 г.
**23.55** Навіны - Беларусь.
**00.05** Фільм «Змова». 2007 г.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**22.25** Баявік «Антыснайпер. Новы ўзровень».
**00.05** Трылер «Небяспечны Бангкок».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 6-ы этап.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/4 фіналу.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131 (Хакуба, Японія).
**13.45** Футбол. Ліга Еўропы. Лёсаванне.
**14.30** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Германія. Дзень 1-ы.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 7-ы этап.
**18.45** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**19.15** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Германія. Дзень 1-ы.
**00.00** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/2 фіналу.
**01.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 7-ы этап.
**03.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 5 серыя.
**07.50** «Папялушка», тэлесерыял: 7, 8 серыі.
**08.40** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**09.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «52 адсоткі», дак. фільм, 2007 г., Польшча–Расія.
**09.50** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 20 серыя.
**10.45** Беларусы ў Польшчы.
**11.10** «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія: 4 серыя, «Апошні шанец».
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 3 серыя.
**12.35** YoLife.
**12.55** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 5 серыя.
**13.25** «Папялушка», тэлесерыял: 7, 8 серыі.
**14.15** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**14.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «52 адсоткі», дак. фільм, 2007 г., Польшча–Расія.
**15.20** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**16.00** «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія: 4 серыя, «Апошні шанец».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял 12 серыя.
**17.35** Хто ёсць кім?: Крыстына Шацікава.
**17.50** Форум (ток-шоу): «Сямейная здрада – распуста ці паратунак?».
**18.35** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 20 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** Праект «Будучыня».
**20.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.40** Героі не нашага часу: «Зінаіда Бандарэнка».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Справа Фэрўэла: шпіён веку», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 1.
**22.20** «Пітбуль», серыял: 24 серыя.
**23.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.15** Аб'ектыў.

## 27 ЖНІЎНЯ, СУБОТА

---

**07.00** Існасць.
**07.25** Добрай раніцы, Беларусь.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** «Славянскі базар-2011».
**10.55** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**12.10** Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (СССР).
**14.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Nota Bene.
**16.40** Дакументальны цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Дзятлаўская перастук» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** Ваша лата.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Ведай нашых.
**19.30** Месца сустрэчы.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Песні мора». Музычны фэст.
**23.50** Драма «Элегія» (ЗША).

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Асяроддзе пасялення.
**12.10** «Пітэр Пэн у Нетландзіі». Анімацыйны фільм.
**13.20** Камедыя «Мімíно».
**15.00** Прысуд.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Канцэрт Сафіі Ратару.
**18.40** Фільм «Сіці - Айленд».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Драма «Капіюючы Бетховена».
**23.00** Фільм «Чорная кніга».

---

**07.05** Мультфільмы.
**07.30** «Сапраўдная гісторыя».
**08.00** Фільм «Знаёмства са спартанцамі». ЗША, 2008 г.
**09.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**09.40** «Чыстая праца».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.00** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**13.20** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.55** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**14.05** Фільм «Старыя разбойнікі «. СССР, 1971 г.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Кружоўнік». Расія, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**20.20** Фільм «Прышэльцы 2: калідоры часу». Францыя, 1997 г.
**22.25** Фільм «Вінаваты па падазроне». ЗША-Францыя, 1991 г.
**00.15** «Зорны рынг».
**01.10** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

---

**06.05** Прыгоды Агента 007. Баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**08.15** Жансавет.
**08.50** Дача здароўя.
**09.30** Фантастычная камедыя «Як Майк» (ЗША).
**11.20** Тэлебарометр.
**11.25** Нашы тэсты.
**12.00** Дыялогі аб рыбалцы.
**12.30** Страсці па культуры.
**13.15** Серыял «Маргоша» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Чэлсі - Норвіч. Прамая трансляцыя.
**18.55** Тэлебарометр.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**21.00** КЕНО.
**21.10** Прыгоды Агента 007. Баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**23.25** Канцэрт «Depeche Mode. Touring the Angel» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільм.
**07.10** «Юрмала-2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.50** Фільм «На вайне як на вайне».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Шукаю цябе». 2010 г.
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлефільм «Кадэты».
**16.10** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля - 2011».
**18.10** «Суботні вечар».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. Фільм «Салямі». 2011 г.
**23.40** Прэм'ера. Фільм «Як я правёў гэтым летам». 2010 г.

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Увага: вышук!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».
**15.15** «Крамлёўскія дзеці».
**16.05** Выратавальнікі.
**16.35** «Следства вялі…».
**17.30** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Руская сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.05** «Ты не паверыш!».
**22.55** Баявік «Антыснайпер. Стрэл з мінулага».
**00.35** Фантастычны баявік «Пасля Апакаліпсісу».

### EUROSPORT

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы.
**09.30** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**09.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы.
**11.00** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131 (Хакуба, Японія).
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131 (Хакуба, Японія).
**13.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 8-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы. Агляд.
**20.00** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Германія. Дзень 2-і.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Брно, Чэхія). Дзень 1-ы.
**00.30** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). Фінал.
**01.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы.
**03.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 2-і.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Машына зменаў», тэлесерыял: 12 серыя.
**07.55** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 20 серыя.
**09.25** Праект «Будучыня».
**09.50** «Справа Фэрўэла: шпіён веку», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 1.
**10.45** Форум (ток-шоу): «Сямейная здрада – распуста ці паратунак?».
**11.30** Хто ёсць кім?: Крыстына Шацікава.
**11.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**12.00** «Машына зменаў», тэлесерыял 12 серыя.
**12.35** Калыханка для самых маленькіх.
**13.10** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 20 серыя.
**14.00** Праект "Будучыня" (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.30** МакраФон: XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: выступ Касі Камоцкай.
**15.05** Героі не нашага часу: «Зінаіда Бандарэнка».
**15.20** «89 міліметраў», дак. фільм, 2004 г., Германія–Беларусь.
**16.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 31 серыя.
**18.00** «Справа Фэрўэла: шпіён веку», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 1.
**18.55** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Англійская для дзяцей.
**19.50** Госць «Белсату».
**20.10** Еўропа сёння.
**20.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Беларускія лёсы: «Забойства напярэдадні вясны», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.40** Суботні сеанс: "Не кажы маме, што нянька памерла», камедыя, 1991 г., ЗША.
**23.25** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**00.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.20** Аб'ектыў.

## 28 ЖНІЎНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.00** Меладрама «Прыкаваны» (Беларусь - Расія).
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.40** Відэафільм АТН «Дзятлаўскія перастук» цыклу «Зямля беларуская».
**10.55** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна).
**12.10** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава» (СССР).
**13.50** Сінематэка.
**14.30** «Млын моды-2011».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.30** Камедыя «Дадатковы час» (Расія).
**18.10** Суперлато.
**19.20** Фантастычны баявік «Тэлепорт» (ЗША).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** «Песні мора». Музычны фэст.
**00.05** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** Камедыя «Кубанскія казакі».
**13.40** «Гарбаты з Нотр-Дама». Анімацыйны фільм.
**15.00** «Забойная сіла». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.30** Фільм «Герой».
**18.20** Вялікі канцэрт.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца». Лепшае.
**22.10** «Yesterday Live».
**23.00** Баявік «Рэмба-4.
**00.20** Фільм «Цягнік на Юму».

**07.05** «Я-вандроўца».
**07.30** Фільм «Прышэльцы 2: калідоры часу». Францыя, 1997 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Каліна чырвоная». СССР, 1973 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «БАТЭ» Барысаў - «Дынама» Мінск. Прамая трансляцыя.
**22.25** Фільм «Аргентынскі дог». Іспанія - Аргентына, 2004 г.
**00.05** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.45** Прыгоды Агента 007. Баявік.
**09.00** «Правы чалавека». Аўтарская праграма.
**09.15** Мір вашай хаце.
**09.25** Гаспадар.
**09.55** Тэлебарометр.
**10.00** Нашы тэсты.
**10.40** Рэальны свет.
**11.15** «БелСубКульт». Дакументальны фільм (НГТРК).
**12.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Прамая трансляцыя.
**15.05** Серыял «Маргоша» (Расія).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Манчэстэр Юнайтэд - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**19.55** Тэлебарометр.
**20.00** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**20.15** Жывы гук.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.15** Прыгоды Агента 007. Баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**23.35** Драма «Добры» (Вялікабрытанія-Германія).

**07.00** «Звычайны канцэрт».
**07.30** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.50** Фільм «Салямі». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «З новай хатай!».
**12.20** Фільм «Першае каханне».
**13.35** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлефільм «Кадэты».
**16.15** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля - 2011».
**18.15** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі.
**20.30** Фільм «Залатыя нябёсы». 2011 г.
**22.15** Фільм «Час шчасця». 2008 г.

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** Дак/ цыкл «Уласны гонар».
**13.00** Сёння.
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».
**15.10** «Крамлёўскія дзеці».
**16.05** «Хвацкія 90-я».
**16.35** «Следства вялі…».
**17.30** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Пугачыха. Фільм-лёс».
**22.40** Прэм'ера. «Імперыя пачуццяў». Навуковы дэтэктыў.
**23.45** Крымінальная меладрама «Бацькі».

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 2-і.
**09.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 1-ы.
**10.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 2-і.
**15.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131 (Хакуба, Японія).
**16.15** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 8-ы этап.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 9-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 2-і. Агляд.
**20.00** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Германія. Дзень 3-і.
**21.00** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Германія. Дзень 3-і.
**23.30** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Бельгія).
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Брно, Чэхія). Дзень 2-і.
**00.30** Мотаспартыўны часопіс.
**00.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 9-ы этап.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 31 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.40** Рэпартэр.
**09.05** Еўропа сёння.
**09.30** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**10.15** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.45** Госць «Белсату».
**11.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**11.15** Беларускія лёсы: «Забойства напярэдадні вясны», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**11.40** «Бульбаны», мультсерыял.
**11.50** «Праваслаўныя манастыры ў Польшчы», дак. фільм, 2006 г., Польшча: 2 серыя.
**12.15** «Не кажы маме, што нянька памерла», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**14.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.25** «Справа Фэрўэла: шпіён веку», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 1.
**15.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.55** «Беспрацоўныя», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**16.25** МакраФон: «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 3.
**17.00** Прыватная калекцыя.
**17.20** «Праведнікі», тэлесерыял: 5 серыя.
**18.05** «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**19.05** Басанож па свеце.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.00** На колах.
**20.30** Вагон.
**20.35** Без рэтушы: «Чатыры сымбалі», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Размовы эксперта.
**22.00** Фільматэка майстроў: «Мастацтва плакаць», маст. фільм, 2006 г., Данія.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

# Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ВЫБАРЫ

# СТРЫПТЫЗ ЗА ПУЦІНА

Алег НОВІКАЎ

**Па меры набліжэння афіцыйнага старту выбараў расійскага прэзідэнта ў краіне набірае моц стрыптыз з палітычным падтэкстам. Цалкам сфармаваныя ў анатамічным сэнсе дзяўчаты абяцаюць парваць на сабе ўсё што можна ў імя любові да кіраўніцтва краіны. Апазіцыя ў адказ таксама распранаецца.**



У сярэдзіне ліпеня ў папулярнай расійскай сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» з'явіліся заклікі да маладых жанчын. Ім прапанавалі ўступіць у «Войска Пуціна». Асноўная задача «навабранцаў» — аказваць падтрымку прэм'еру на выбарах 2012 года. Сваю адданасць кіраўніку расійскага ўрада актывісткі гатовыя былі выказаць тым, што парвуць на сабе вопратку.

«Войска Пуціна» — аб'яднанне маладых дзяўчын, якія «парвуць» за Пуціна. «Мы пакажам, што Уладзіміра Уладзіміравіча падтрымліваюць шматлікія, у тым ліку прыгожыя, маладыя і разумныя дзяўчаты! Пуцін — сумленны палітык, а таксама і шыкоўны Мужчына!» — гаварылася ў маніфесце групы. Адначасова на старонцы групы адзначалася, што запісвацца туды могуць выключна дзяўчыны без комплексаў.

Прэм'ера «Войска Пуціна» адбылася 21 ліпеня перад галоўным будынкам МДУ. Дзяўчаты правялі акцыю «аўтамойка», падчас якой яны, апранутыя ў бікіні, бясплатна мылі аўтамабілі расійскай вытворчасці. Як растлумачылі ўдзельніцы акцыі, такім чынам яны падтрымалі расійскі аўтапрам — адну з любімых фішак Пуціна. Нягледзячы на знешні эфект, журналісты засталіся расчараваныя. Абяцанне парваць на сабе адзежу за кіраўніка ўраду выканала толькі адна дзяўчына, якая, як пісала прэса, была ў «несэксуальным бюстгальтары».

Аднак аўтамойка ўсё роўна нарабіла шуму. Таму 4 жніўня на палітычную арэну выйшла група фанатаў Мядзведзева. Прыхільніцы прэзідэнта, якія называлі сябе Medvedev girls, у Новапушкінскім скверы выказвалі мінакам гатоўнасць зняць з сябе адзенне ў абмен на піва. Такім чынам яны выказвалі салідарнасць з прэзідэнцкім законам аб забароне распіцця піва ў грамадскіх месцах. Для таго, каб дзяўчына цалкам стала ню, трэба было набыць ёй 6 літраў піва. Хаця ахвотнікаў мяняць піва на адзенне не знайшлося, тры дзяўчыны ўсё роўна распрануліся да бялізны. Нарэшце, 8 жніўня прыхільніцы прэзідэнта РФ і прэм'ер-міністра РФ зліліся ў адзіным парыве і пракаціліся па цэнтру Масквы на двухмесных веласіпедах. На гэты час прэса ўжо пранюхала, што «Войска Пуціна» — гэта праект пракрамлёўскага моладзевага руху «Наши».

Нягледзячы на малую колькасць удзельніц усіх апісаных акцый, яны набылі значны рэзананс. Расійскі інтэрнэт ахвотна каментуе новы піяр-крок улады, які ўжо атрымаў назву «гламурны патрыятызм». Рэакцыя ў большасці негатыўная.

«Медвепуты аплачваюць голы піяр. Маладыя дзяўчыны агаляюцца за падарункі. Некаторыя робяць гэта бясплатна. У любым выпадку, заахвочваецца жаданне распранацца. У кожнай прыстойнай краіне такія акцыі кампраметуюць уладу, але не ў нас! Яны, наадварот, атрымліваюць розгалас у прэсе. Заўважце, па краіне ў апошні час пракацілася хваля страйкаў. Пра некаторыя з іх можна знайсці інфармацыю толькі ў дзённіках людзей, якія былі сведкамі гэтых акцый. Замест гэтага нам паказваюць дзяўчын у бікіні, якія падтрымліваюць прэзідэнта і экс-прэзідэнта», — піша адна блогерша.

Як і трэба было чакаць, не знаходзяць сабе месца абаронцы маралі. Вось прыклад іхняга тыповага каментару: «Мы забыліся, што руская жанчына заўсёды лічылася эталонам прыгажосці, цноты, душэўнасці, адданасці. Пасля развалу СССР дэградавала ўсё. Як краіна, так і грамадства. «Войска Пуціна» таму лепшы прыклад. Ходзяць напалову голыя дзеўкі без сораму і сумлення, і ў дадатак заклікаюць ірваць на сабе адзенне за гэтых сумнеўных персанажаў — Пуціна і Мядзведзева. Куды падзелася прыстойная расійская дзяўчына? Хаця, які поп, такі і прыход».

Асабліва абураюцца бацькі, якія маюць дачок. «Як маці скажу, што, калі б мая дачка,ываліўшы голыя сіські і зад, гарлапаніла: «Парву за Пуціна!», я б сваімі рукамі задушыла прастытутку ганебную!» — піша адна маці.

Як ні парадаксальна гучыць — тое, як эмацыйна і масава народ рэагуе на дастаткова сціплыя акцыі аматарак Пуціна, кажа пра эфектыўнасць палітычнага стрыптыз-піяру. Гэта нешта новае ў расійскіх палітычных тэхналогіях. Як слушна адзначае «Figaro»: «У Расіі, дзе феміністкіх ініцыятыў практычна няма, выкарыстанне жаночага цела ў камерцыйных ці палітычных мэтах — распаўсюджаная практыка. Мужчынам падабаецца жаночае цела, таму гэта добры спосаб прыцягнуць іх увагу». Гэта, здаецца прызнае нават антыпуцінская апазіцыя, якая спачатку называла дзяўчын з «Войска Пуціна» самымі пахабнымі словамі.

У сетцы «ВКонтакте» аператыўна створана група супраць «Войска Пуціна». У паведамленні антыарміі гаворыцца, што яе сябры лічаць праект «Парву за Пуціна» «праплачанай ідэяй урада або чарговым трызненнем мажораў». Сябры антыарміі Пуціна таксама гатовыя рваць на сябе адзенне, аднак, наадварот, у знак пратэсту супраць ВВП.




Пакуль антыармія толькі збіраецца нешта рваць, радыкальная апазіцыя дзейнічае. 5 жніўня ў інтэрнэце з'явіўся ролік ад дзяўчын з пецярбургскага аддзялення незарэгістраванай партыі Эдуарда Лімонава «Другая Расія». Феміны абвясцілі «стрыптыз-бітву» красуням, якія падтрымліваюць прэм'ера. Бітва заключалася ў тым, што маладыя апазіцыянеркі, апранутыя ў чорныя міні-сукенкі, чорныя туфлі на абцасах, стралялі ў ціры па драўляных фігурках мядзведзя, на якіх чырвоным было напісана «Партыя жулікаў і злодзеяў». Пасля гэтага яны разарвалі на грудзях сукенкі, пад якімі былі белыя станікі з малюнкам гранаты «лімонкі» — знак забароненай Нацыянал-бальшавіцкай партыі Лімонава. Мяркуючы па ўсім, гэты ролік не апошні. Таксама можна чакаць стварэння новых стрыптыз-армій.

Імклівая эратызацыя расійскай палітыкі ўжо стала аб'ектам шэрагу артыкулаў у сур'ёзнай прэсе. «Независимая газета» лічыць, што гламурны патрыятызм — моцная зброя супраць распаўсюду апазіцыйных настрояў у рускім сегменце інтэрнэта напярэдадні выбараў. Дзеўкі ў бікіні — добрая канкурэнцыя сумным антыўрадавым артыкулам, якія і без таго усім надакучылі.

А вось для амерыканскага часопісу «Foreign Policy» тыя бікіні — знак новай стадыі эвалюцыі пуцінскай Расіі: «Мы можам з пажадай глядзець на юных лаялістак, якія дасягнулі піку палавой сталасці; назіраць за Пуціным, які падчас свайго трэцяга за ўсё жыццё апускання з аквалангам адшукаў грэчаскую амфару шостага стагоддзя (і апынуўся сапраўдным экспертам-археолагам, якія здолелі ўсталяваць яе ўзрост). Мы можам таксама зрабіць сабе прызнанне ў тым, што ў Расіі, якая перажыла нядоўгі і непрыемны перыяд постсавецкай дэмакратыі, больш няма палітыкі».

Сапраўды, ёсць думка, што цяперашні выбух гламуру з'яўляецца толькі размінкай. Пік палітычнага стрыптызу, як піша выданне «Глобалист», «прыпадзе на кульмінацыйны момант выбарчай кампаніі, калі ўзнікне сталы попыт на паненак, якія крычаць «ура» і кідаюць у паветра чэпчыкі ці іншыя прадметы гардэроба».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Расія афіцыйна паабяцала зніжку на газ для Беларусі ў адказ на яе далучэнне да Адзінай эканамічнай прасторы і ў абмен на кантроль «Газпраму» над «Белтрансгазам». Аднак прадметныя перамовы з рэспублікай пра кошт газу і памеры зніжкі, па вялікім рахунку, не пачыналіся. Заявы расійскіх уладаў могуць быць усяго толькі элементам ціску на Украіну, якая, у адрозненне ад Беларусі, прынцыпова не гатовая аддаваць Расіі кантроль над сваёй газатранспартнай сістэмай.

**«Коммерсант» (Расія)**

Дваістасць пазіцыі кіраўніцтва РФ не толькі ставіць у тупік беларускую апазіцыю, але і дае перавагі цяперашняму рэжыму, галоўнай мэтай якога з'яўляецца ўтрыманне ўлады ў сваіх руках як мага даўжэй, не прагназуючы наступстваў. Даводзіцца зрабіць выснову, што Беларусь на сённяшні дзень практычна нікога не цікавіць — ні Захад, ні Расію, ні ўнутраную апазіцыю, занятую выжываннем. У такіх умовах Рэспубліка Беларусь рызыкуе ўстаць на шлях трансфармацыі палітычнай апатыі ў нацыянальны нігілізм, пры якім шанцаў стаць паўнавартаснай нацыяй у беларусаў практычна не будзе.

**РЕГНУМ (Расія)**

Па меркаванні аналітыкаў, лёс лідараў Егіпту і Туніса наводзіць некаторых нязменных постсавецкіх кіраўнікоў на малапрыемныя думкі. Нурсултан Назарбаеў узначальваў краіну — у якасці першага сакратара рэспубліканскага ЦК, а затым прэзідэнта, — 22 гады, Аляксандр Лукашэнка і Эмамалі Рахмонаў — 17 гадоў. І, мяркуючы па ўсім, ім, як казаў сябра Палітбюро Ягор Лігачоў, «д'ябальскі хочацца працаваць» і далей. Калі раней некаторыя краіны ўспрымалі сяброўства ў АДКБ ледзь не як клопат, то падзеі ў Афрыцы іх ацвярозілі.

**BBC (Вялікабрытанія)**

Але ўжо цяпер зразумела, што гэтыя падзеі ўскладняць спробы Літвы і Польшчы ўзмацніць беларускую апазіцыю. Якія б ні былі чыннікі перадачы інфармацыі Беларусі, рэпутацыя Літвы і Польшчы як устойлівых прыхільнікаў беларускіх апазіцыянераў пастаўлена пад сумнеў. Гэта не азначае, што яны спыняць падтрымліваць апазіцыю — падтрымка працягнецца, — але зараз дзеючыя ў Літве і Польшчы апазіцыйныя групы і няўрадавыя арганізацыі Беларусі будуць значна больш сумнявацца ва ўласнай бяспецы. А гэта значыць, што актыўныя спробы дзвюх краін зблізіць Беларусь з Еўропай і аддаліць яе ад Расіі закончыліся правалам, выклікаўшы радасць у Масквы.

**«Stratfor» (ЗША)**

Не варта выключаць, што фактычная «здача» беларускіх апазіцыянераў — следства кулуарных дамоўленасцяў Грыбаўскайтэ і Лукашэнкі. Але навошта Літве спрыяць ціску на незалежную грамадзянскую супольнасць? Калі для большай часткі Еўропы адхіленне Лукашэнкі ад улады і наступны пераход да дэмакратыі (з пункту гледжання еўрапейцаў) з'яўляецца мэтай нумар адзін, то Літве значна важней яе дзяржаўныя, геапалітычныя, гістарычныя, антырасійскія інтарэсы. А такія малаважныя рэчы, як дэмакратыя, свабода, правы чалавека, арыштаваныя беларускія праваабаронцы, могуць і пачакаць.

**«Politkom» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЗША. ЯШЧЭ АДЗІН АКТОР ІДЗЕ Ў ПАЛІТЫКУ

Алек Болдуін вырашыў паспрабаваць сябе ў палітычнай сферы. Ён будзе балатавацца ў муніцыпальны савет Нью-Ёрку. Праўда, паход ва ўладу адбудзецца не хутка — толькі ў 2017 годзе. Справа ў тым, што амбіцыі Болдуіна абмежаваныя кантрактам з кампаніяй NBC. Болдуін вядомы сваімі прагрэсіўнымі поглядамі, таму, верагодней за ўсё, будзе ісці на выбары ад Партыі дэмакратаў. Назіральнікі супярэчліва ўспрынялі амбіцыйныя заявы акцёра. На яго хапае кампрамату. Дастаткова згадаць гучны разрыў шлюбу са славутай Кім Бесінджэр два гады таму. З іншага боку, фільмы і серыялы, дзе здымаецца Болдуін, вельмі паспяховыя, таму шмат галасоў палітыку-пачынальніку яўна забяспечана.

**Па матэрыялах амерыканскай прэсы**

### ІНДЫЯ. ДАЛАЙ-ЛАМА АБРАЎ ПЕРАЕМНІКА

Адвакат Лабсанг Сангей афіцыйна заступіў на пасаду лідара тыбецкага ўраду ў выгнанні. Прэм'ерам ён стаў па выніках праведзеных у сакавіку выбараў сярод сяброў тыбецкай дыяспары па ўсім свеце. Паколькі раней пасада прэм'ера належала Далай-ламе, то фармальна Лабсанг цяпер узначаліць увесь тыбецкі рух. Аднак слаба верыцца ў тое, што ён зможа цалкам замяніць 76-гадовага Далай-ламу, які з'яўляецца жывым сімвалам супраціву тыбетцаў супраць кітайскай каланізацыі. Хутчэй за ўсё, Лабсанг будзе выконваць нейкія тэхнічныя функцыі, якія раней мусіў выконваць Далай-лама. Цікава, што новы тыбецкі прэм'ер не толькі не нарадзіўся ў Тыбеце, аднак нават ніколі там не жыў. Аднак гэта, па яго словах, не будзе перашкаджаць яму змагацца за свабоду гістарычнай радзімы. Калі меркаваць па першых інтэрв'ю новага кіраўніка ўраду, ён палітык-рэаліст. Першай задачай лічыць не аднаўленне незалежнасці Тыбету, а пашырэнне яго аўтаноміі ў складзе КНР.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### АРГЕНЦІНА. МУЛЬТФІЛЬМ ПРА ЭВУ ПЕРОН



На экраны кінатэатраў Аргенціны выйшаў першы ў гісторыі поўнафарматны мультфільм на палітычную тэматыку. Ён прысвечаны Эве Перон — жонцы дыктатара, якая па сутнасці замест мужа кіравала краінай. Эва стала культавай фігурай у Аргенціне. Народныя масы дасюль удзячныя ёй за шэраг прагрэсіўных сацыяльных законаў. Мультфільм выкананы ў жанры рамантычнай казкі: бедная акторка Эва дзякуючы шлюбу з вайскоўцам Хуанам Перонам становіцца прынцэсай і дапамагае ўсім людзям. Застаецца дадаць, што фільм выйшаў у пракат у вельмі цікавы час. У лістападзе ў краіне прэзідэнцкія выбары, у якіх удзельнічае цяперашні гарант Крысціна Кіршнер. У сваёй кампаніі яна ўвесь час праводзіць паралелі паміж сабой і Эвай Перон. Пакуль, калі глядзець на нядаўні правал яе партыі на выбарах сталічнага мэра, такая асацыяцыя не спрацоўвала.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. ЮБІЛЕЙ НАЦЫСЦКАЙ АЛІМПІЯДЫ

Неанацысты Германіі святкуюць 81-ю гадавіну Берлінскай алімпіяды, якая прайшла ўлетку 1936 года. На іх думку, гэта прыклад арганізацыі спартовых мерапрыемстваў, што, дарэчы, сапраўды прызнала тагачаснае кіраўніцтва Міжнароднага алімпійскага камітэта. Алімпіяда была сродкам прапаганды поспехаў нацысцкай мадэлі. Таму грошай на яе не шкадавалі. Калі б у Гітлера было больш часу, ён бы стварыў яшчэ грандыёзнейшае шоў. У гэтым плане гісторыкі лічаць, што Берліну вельмі пашанцавала. З-за таго, што падрыхтоўка да спаборніцтва пачалася фактычна за 2 гады, шмат аб'ектаў вырашылі не будаваць. Напрыклад, спачатку планавалася пабудаваць у цэнтры сталіцы Германіі грандыёзны, падобны на рымскі Калізей, антычны стадыён. Што тычыцца тэзісу пра добрую арганізацыю алімпіяды, то тут шмат спрэчнага. Берлінская алімпіяда стала першай алімпіядай, якая падзяліла сусветную спартовую грамадскасць. Працоўнікі фашызму арганізавалі альтэрнатыўную алімпіяду ў Барселоне, якую, праўда, давялося прыпыніць з-за путчу генерала Франка.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. «САЛІДАРНАСЦЬ» НА ПАРОЗЕ РАСКОЛУ

Як піша ўплывовае польскае выданне «Rzeczpospolita», славуты прафсаюз «Салідарнасць» знаходзіцца на парозе расколу. Фармальна раскол можа адбыцца ў наступны аўторак, калі ў Гданьску пройдзе пасяджэнне Краёвай камісіі (кіруючы орган прафсаюзу). Прычына канфрантацыі — стаўленне цяперашняга кіраўніцтва прафсаюзу і яго лідара Пётра Дуды да ўраду «Грамадзянскай платформы». На думку часткі прафсаюзнікаў, Дуда занадта някрытычна ставіцца да эканамічнай палітыкі кабінету ДональдаТуска. У сваю чаргу, Дуда лічыць, што яго апаненты выконваюць загад палітычнай апазіцыі, якая напрэрдадні хуткіх выбараў у Сейм зацікаўленая ў канфлікце грамадства і ўлады. «Мы прафсаюз, а не палітычная партыя», — кажа Пётр Дуда. Цікава, што пасяджэнне камісіі, ад вынікаў якой залежыць лёс прафсаюзу, адбудзецца ў той самай залі, дзе ў жніўні 1980-га была падпісаная славутая дамова паміж забастоўшчыкамі і ўрадам Польскай Народнай Рэспублікі.

**Па матэрыялах «Rzeczpospolita» (Польшча)**

СКАНДАЛ

# АБЯЛІЦЬ АНДРЭСА БРЭЙВІКА

**Алег НОВІКАЎ**




**Каб абяліць тэрарыста-ісламафоба Андрэса Брэйвіка, еўрапейскія правыя партыі выдумляюць самыя неверагодныя канспіралагічныя тэорыі.**

Ад надыходзячай восені еўрапейскія правыя чакаюць шмат. У верасні пройдуць выбары ў берлінскі парламент, куды актыўна рвецца створаная ўвесну партыя «Свабода». На лістапад прызначаныя мясцовыя выбары ў Нарвегіі, якія, па прагнозах, маглі прынесці Партыі прагрэсу (дарэчы, яе сябрам быў Брэйвік) прыкладна 16 працэнтаў дэпутацкіх мандатаў. У Францыі вось-вось пачнецца прэзідэнцкая кампанія, якая стане тэстам для Марыны ле Пэн, лідара Нацыянальнага фронту.

Аднак цяпер шансы ісламафобаў выглядаюць не так бліскуча. Масакра, якую ўчыніў Андрэс Брэйвік 22 ліпеня ў Осла і на востраве Утойа, дэманізавала партыі, якія будуюць свае праграмы на антыісламскай рыторыцы. Кепскую паслугу зрабілі самі сабе і правыя. Некаторыя пабачылі ў нарвежцы «абаронцу Захаду» і «новага Карла Мартэла» (французскі сярэднявечны кароль, які спыніў арабаў у бітве пры Пуацье). Менавіта так характарызаваў Брэйвіка адзін з сябраў Нацыянальнага фронту. Усё гэта прывяло да адтоку сімпатый сярэдняга класа ад партый гэтага накірунку. У той жа Нарвегіі рэйтынг прагрэсістаў адразу пасля 22 ліпеня рухнуў да 5 працэнтаў. Палітолагі ўвогуле пішуць, што з-за акцыі Брэйвіка антыісламскі рух у Еўропе будзе законсерваваным як мінімум на бліжэйшы электаральны цыкл.

У выніку радыкальныя правыя ламаюць галаву, што рабіць з Брэйвікам. Існуюць як мінімум тры стратэгіі. Першая — радыкальна адмежавацца ад скандынава-вар'ята. Менавіта так паступіла большасць вялікіх правых партый Еўропы. Каб прадэманстраваць непрыняцце метадаў Андрэса, кіраўніцтва некаторых партый нават арганізавала чыстку актывістаў, якія публічна выказалі павагу Брэйвіку.

Другая стратэгія — перакласці ўсю адказнасць на грамадства. Дакладней, на яго мультыкультурны характар, які быццам супярэчыць свядомасці белага еўрапейца, выклікае ў яго мазгах дзівіяцыю і ў выніку штурхае на антыграмадскія ўчынкі. Так прынамсі лічыць сенатар румынскага парламенту Юліян Урбан. А вось Жан-Мары ле Пэн прамым тэкстам заявіў, што ва ўсім вінаваты не Брэйвік, а «наіўны» нарвежскі ўрад, які патрэбным чынам не ўзброіў паліцыю. Гэтая фраза, дарэчы, дорага каштавала Нацыянальнаму фронту.

Нарэшце, трэцяя стратэгія — проста прыдумаць канспіралагічную тэорыю, адпаведна якой Брэйвік быў пешкай у нейкай глабальнай гульні, мэта якой відавочна — скампраметаваць нацыянальны рух. Тут правыя далі сваёй фантазіі поўную волю. Напрыклад, на сайтах французскіх правых папулярная тэорыя пра тое, што Брэйвік быў масонам. Аргумент тут просты: хіба нармальны хрысціянін будзе страляць па людзях і падкладваць бомбы? Натуральна, не. Значыць, Брэйвік не хрысціянін, а, наадварот, вораг хрысціянства. Значыць, ён вольны муляр.

Дадатковыя аргументы былі выкапаныя шляхам шматразовага прагляду выкладзеных на you tube відэазапісаў Брэйвіка і штудзіравання ягонай літаратурнай спадчыны. У адным з кадраў фільму можна пабачыць нейкія падобныя на масонскія сімвалы, на фоне якіх стаіць Андрэс. У сваіх запісах ён згадвае, што ў дзяцінстве марыў стварыць секту, падобную на ордэн тампліераў (ордэн лічыцца правобразам масонскіх ложаў). Адным словам, прыхільнікам тэорыі масонскай змовы ёсць за што зачапіцца.

**Рэйтынг лейбарыстаў цяпер самы высокі з 1985 года (40 працэнтаў). Больш таго, іх лідар, прэм'ер-міністр Нарвегіі Йенс Столтэнберг больш папулярны, чым кароль**

А вось нямецкія нацыянал-дэмакраты лічаць, што тэракт арганізавалі нарвежскія спецслужбы. У якасці доказаў яны спасылаюцца на гісторыю правага тэрору. Напрыклад, згадваецца тэракт на піўным фестывалі ў Мюнхене ў 1981 годзе або выбух на вакзале ў Балонні ў 1977-м. Першы і другі тэракт арганізавалі правыя экстрэмісты. Аднак падчас следства ўзнікла версія, што іх учынкі былі інспіраваныя звонку. Тэрарысты маглі быць звязаныя з некаторымі ўрадавымі чыноўнікамі або сілавікамі.

Адпаведна нямецкім нацдэмам, падобны сцэнар меў месца і ў Нарвегіі. Апошнім часам у гэтым рэгіёне набіраюць моц правыя партыі. Каб прытармазіць працэс, нарвежскія лейбарысты, якія разам з Зялёнымі фармуюць урад, вырашылі з дапамогай тэракту сапсаваць рэнаме ісламафобаў. Быў знойдзены адпаведны вар'ят у выглядзе Брэйвіка, які выканаў чорную справу. У выніку ісламафобы ператварыліся ў ворагаў народу, а эсдэкі, наадварот, сталі белыя і пухнатыя. Сапраўды, рэйтынг лейбарыстаў цяпер самы высокі з 1985 года (40 працэнтаў). Больш таго, іх лідар, прэм'ер-міністр Нарвегіі Йенс Столтэнберг больш папулярны, чым кароль. Ніколі ў гісторыі Нарвегіі палітык не быў больш папулярным за Яго Вялікасць.

Цікава, што тэорыя пра спецслужбы рыкашэтам б'е па саміх ультраправых. Яе аўтар прызнае, што ў гэтым асяроддзі шмат людзей з нездаровай псіхікай, які лёгка становяцца аб'ектам маніпуляцый агентаў.

Ну і, натуральна, не абышлося без яўрэйскага следу. З гэтай тэорыяй носіцца Брытанская нацыянальная партыя і орган нямецкіх мааістаў «Rote Fahne». Калі верыць ім, усё было так: кіраўніцтва ізраільскай разведкі «Масад» даведалася, што нарвежскія лейбарысты выступаюць за прызнанне Палесцінскай дзяржавы, і вырашыла іх жорстка пакараць. Лепшым кандыдатам на выкананне місіі аказаўся ўсё той жа наіўны і даверлівы Андэрс Брэйвік.

Наколькі ў правых атрымалася адмежавацца ад Брэйвіка, пакажуць бліжэйшыя выбары. Аднак відавочна, што цалкам праблема не вырашана. Справа ў тым, што існуе вялікая інтэрнэт-супольнасць працоўнікаў так званай ісламскай экспансіі, якая ўсё часцей фармуе палітычную дыскусію правага электарату. Аўтары блогаў часта не лічацца з тэндэнцыямі грамадскай думкі і пішуць тое, што ў галаву прыйдзе. Так, самы папулярны нямецкі правы блог Politically Incorrect, які штодня наведваюць каля 75 тысяч чалавек, упарта працягвае шукаць пазітыў у паводзінах нарвежскага тэрарыста.

ПАСЛЯ ПАДЗЕЙ

# ЦІ ПЕРАМОЖА БРЫТАНІЯ ІНТЭРНЭТ?

Алег НОВІКАЎ

**Брытанскія кансерватары ў якасці перастрахоўкі ад новых моладзевых бунтаў плануюць абмежаваць доступ да сацыяльных сетак.**



Упершыню лідар торы сфармуляваў ідэю абмежавання доступу да сацыяльных сетак у фармаце пытання самому сабе. Адбылося гэта ў рамках яго выступу ў парламенце падчас пазатэрміновай сесіі, прысвечанай беспарадкам. Дэвід Кэмеран задаўся пытаннем: «Магчыма, будзе добра, калі мы забаронім камунікацыю праз інтэрнэт паміж людзьмі, якія плануюць гвалт, хаос і злачынства?»

Літаральна на наступны дзень прэм'ер, здаецца, вызначыўся з адказам. Стала вядома, што ўрад ламае галаву над тым, якімі срodкамі абмежаваць доступ да Twitter і Facebook для тых, «хто плануе крымінальную дзейнасць». Непасрэдна, па словах лідара кабінету, хуліганам забароняць дасылаць паведамленні. Дзяржсакратар Тэрэза Мэй, у сваю чаргу, запрасіла адміністрацыю кампаній Facebook, Twitter і Research In Motion на сустрэчу, прысвечаную планам ураду. Дэбаты таксама звязаныя з праблемай ананімнасці. Кэмеран хоча закону, які дазваляе паліцыі «пры некаторых абставінах» вызначаць асобу ананімнага карыстальніка.

Тое, што сацыяльныя сеткі адыгралі важную ролю ў апошніх падзеях, ніхто не аспрэчвае. Газета «Guardian» прыводзіць словы паліцэйскага афіцэра, які з настальгіяй згадвае беспарадкі ў Нотынгеме ў 1985 годзе. Тады, пасля забойства паліцыяй мясцовай дзяўчыны, таксама мелі месца пагромы і сутычкі з Бобі (мянушка брытанскіх паліцэйскіх). Паліцыя лёгка вылічвала лідараў хуліганаў, паколькі яны, каб каардынаваць натоўп, ужывалі мегафоны. Праз 20 гадоў функцыю мегафона выканалі мабільнікі і сацыяльныя медыя.

Першыя анлайнавыя дыскусіі ў Facebook наконт помсты за забітага паліцыяй Марка Дагана пачаліся праз некалькі гадзін пасля інцыдэнту. Там жа была прызначаная першая кропка для пратэсту — станцыя метро Tottenham High Road а 10-й гадзіне вечара. Пасля бойкі з'явіўся заклік выкладваць у сеціва любыя здымкі са станцыі.

Самую грозную зброю для паліцыі, аднак, уяўлялі не сацыяльныя сеткі, а BlackBerry — смартфоны і мабільнікі для перадачы электронных паведамленняў. BlackBerry карыстаюцца 37 працэнтаў брытанскіх тынейджараў. Іх папулярнасць тлумачыцца вельмі проста — кампанія дазваляе бясплатна дасылаць BBM — так называюцца паведамленні ў сетцы BlackBerry. Адметнай асаблівасцю смартфонаў з'яўляецца выкарыстанне адмысловага сэрверу (BlackBerry Enterprise Server, BES) і магчымасці шыфравання па стандарце AES для абароны паведамленняў ад перахопу. Дарэчы, менавіта таму ў Расіі смартфоны BlackBerry доўгі час афіцыйна не прадаваліся — спецслужбы не дапускалі іх імпарт у краіну. Такім чынам паліцыя не можа кантраляваць аўтараў BBM.

Менавіта такая ананімная BBM з заклікам сабрацца і ўчыніць пагром Оксфард-стрыт была дасланая ў мінулую нядзелю ў сетку BlackBerry. У выніку на Оксфард-стрыт сапраўды адбыўся буйны пагром, па слядах якога дырэктар сталічнай паліцыі ўвогуле выступіў за забарону ўсіх сацыяльных сетак.

Нягледзячы на трагічныя наступствы той жа бойкі на Оксфард-стрыт, асаблівага захаплення планамі ўраду наконт рэпрэсій супраць сацыяльных сетак брытанская грамадскасць не праяўляе.

Голасна пратэстуе лейбарысцкая апазіцыя. «Рэгулярныя рэфлексы сведчаць пра небяспеку, якую прадстаўляе цяперашні брытанскі ўрад, які лічыць, што павінен кантраляваць медыя. Асцярожна, мой сябра Дэвід. Калі адно слова забароненае, уся прамова не вольная. Цэнзура супярэчыць разуменню цывілізацыі», — піша блізкая да іх «Tribune».

«Guardian» сцвярджае, што абмежаванне сацыяльных сетак зробіць брытанскі ўрад падобным на кіраўніцтва Кітаю і арабскія тыраніі. Самае смешнае, што афіцыйны Пекін ужо сапраўды вітаў ваяўнічыя выразы Кэмерана. У пасланні афіцыйнага кітайскага агенцтва «Сіньхуа» гаворыцца: «Для дабрабыту грамадства маніторынг у сеціве легальны і патрэбны. Для нас застаецца не зразумелым толькі адно: чаму заходнія палітыкі абвінавачваюць іншыя нацыі ў маніторынгу інтэрнэту і адначасова выступаюць за маніторынг і кантроль інтэрнэту дома».

З лейбарыстамі салідарныя правазнаўцы. Арганізацыя адвакатаў «Open Rights Group» знаходзіць, што палітыка Кэмерана «рызыкуе падарваць фундаментальныя грамадзянскае права на свабоду слова». «Як можна вызначыць, што чалавек плануе беспарадкі? Хто зробіць такое заключэнне? Адзіны магчымы адказ на гэтае пытанне можа даць выключна суд. У іншым выпадку ўсё закончыцца сваволлем прыватных кампаній і паліцыі», — гаворыцца ў заяве «Open Rights Group».

Існуе яшчэ адна нелагічнасць у тым, што робіцца на Даўнінг-стрыт. Дэвід Кэмеран гучна абвясціў пра крыжовы паход супраць сацыяльных сетак, не маючы падтрымкі лібералаў — партыі, якая разам з кансерватарамі ўваходзіць у кабінет. Лібералы адмоўна паставіліся да ідэі цэнзуры сацыяльных медыя. Партыйная канферэнцыя на днях прыняла спецыяльны зварот да Ніка Клега, ліберальнага віцэ-прэм'ера, заклікаючы яго не дапускаць рэалізацыі планаў торы ў сферы кантролю інтэрнэту. Лібералы, як і лейбарысты, схіляюцца да таго, каб распрацаваць праграму дапамогі бедным і небяспечным у крымінальным плане раёнам, а не ўводзіць там амаль паліцэйскае становішча, як плануе Кэмеран. У той час, калі апошні ваюе з інтэрнэтам, лібералы актыўна рэкламуюць створаную ў сацыяльных сетках ініцыятыву Riots Cleen, сябры якой прыбіраюць з вуліц наступствы беспарадкаў. Riots Cleen падаецца як прыклад таго, што Facebook і Twitter не такія ўжо жудасныя рэчы.

Здаецца, толькі адна сацыяльная група актыўна падтрымала ідэю ўраду. Гэта рэдакцыі жоўтых газет, для якіх тэма арганізацыі бунтаў праз сацыяльны сеткі стала залатой жылай. Так, «Daily Express» паведамляе, што арганізатары лонданскіх беспарадкаў вывучалі рэвалюцыйныя магчымасці сістэмы Twitter у Расіі на базах ФСБ.

З улікам прававых, тэхнічных нюансаў і пазіцыі партнёраў па кааліцыі, планы Кэмерана ўтаймаваць інтэрнэт здаюцца дастаткова ілюзорнымі. Адзіная рэформа, якая сапраўды магчымая, — пашырэнне доступу паліцыі да зачыненых групаў у сацыяльных сетках. Дэпутат парламенту ад Тотэнхема ўжо заклікаў кампанію Research In Motion (распрацоўшчык BlackBerry) змяніць механізм BBM.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МІШЭЛЬ БАХМАН



Сябра кангрэсу ЗША ад Рэспубліканскай партыі і актывістка яе правай фракцыі Tea Party нечакана для ўсіх перамагла па выніках апытання ў штаце Аёва, дзе ў фармаце тэледэбатаў прайшлі так званыя тэсты выбараў кандыдата ад Рэспубліканскай партыі. Па выніках галасавання гледачоў Мішэль абскакала шэраг канкурэнтаў. Адзін з прайграўшых (дарэчы, былы губернатар штату Мінесота) пасля канфузу ўвогуле адмовіўся ўдзельнічаць у кампаніі. Сама Бахман кажа, што гэта быў «першы крок на шляху ў Белы дом». Аднак галоўныя баталіі наперадзе. Цяпер Мішэль павінна давесці сваю перавагу над галоўнымі фаварытамі — спікерам Палаты прадстаўнікоў Мітам Ромні і тэхаскім губернатарам Рыкам Пэры, які ўступіў у выбарчую гонку адразу пасля тэстаў у Аёве. Цікава, што Бахман перамагла нават пасля таго, як прызналася, што адпаведна запаведзям Бібліі павінна ва ўсім слухацца свайго мужа і будзе гэта рабіць нават на пасадзе гаспадара Белага дому, калі яе абяруць прэзідэнтам.

### КРЫСЦІЯН ФОН БЁЦІХЕР




Лідара секцыі Хрысціянска-дэмакратычнага саюзу (CDU) у зямлі Шлезвіг-Гальштэйн цяпер усе называюць нямецкім Дамінікам Строс-Канам. Усё пасля таго, як 40-гадовы жанаты палітык пагарэў на інтымнай сувязі з 16-гадовай дзяўчынкай, у якую, па яго словах, ён быў доўгі час закаханы. Увогуле, здаецца, сэксу паміж імі не было (нават калі быў, то нямецкі закон пры ўмове згоды абодвух бакоў у такім узросце гэта дазваляе). Аднак з-за ціску прэсы і грамадскасці, якая знайшла ў яго ўчынках «маральны кампанент», фон Бёцікер па свайму жаданню адмовіўся быць партыйным лідарам. Самае смешнае, што адносіны паміж ім і дзяўчынкай былі разарваныя менавіта напярэдадні цяперашняга скандалу. Для мясцовага CDU прыгоды Крысцяна — шок. Праз дзевяць месяцаў зямля абірае рэгіянальны парламент, а лідара ў партыі няма. Між тым, час цісне: ужо 4 лістапада трэба прад'явіць электарату кандыдата ад CDU на пасаду прэм'ера зямлі.

### МІКОЛА АЗАРАЎ

Прэм'ер украінскага ўраду атрымаў у народзе новую мянушку — «Дон г...дон». Усё з-за таго, што ён некалькі разоў на публіцы гучна заявіў пра намер вызваліць краіну ад імпартных прэзерватываў і памперсаў. «Мы пабудуем свае прадпрыемствы і забяспечым сябе самі. Нічога складанага тут няма. Калі мы ўжо ракеты навучыліся будаваць…» — сказаў Азароў на мінулым тыдні. Здавалася, у краіне ёсць значна большыя праблемы, чым сродкі кантрацэпцыі. Шмат хто спісвае выказванні дырэктара Саўміну наконт гумавых прадметаў на характар адносінаў паміж прэзідэнтам Януковічам і падначаленымі. Між тым, як пішуць аналітыкі, магчыма, Азараў папросту спрабуе ў нейкай ступені рэалізаваць сваю мару пра аднаўленне на Украіне дзяржаўнага сектару вытворчасці, які, па яго словах, павінен гарантаваць выжыванне нацыі. Магчыма, вытворчасць прэзерватываў — менавіта тая галіна, дзе дасягнуць незалежнасці ад прыватнага сектару і пасярэднікаў найбольш проста.



МЕМУАРЫ

# ПЕРАБУДОВА ЯК ФАКТАР БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ

Леанід ЛЫЧ

**Споўнілася 20 гадоў, як Беларусь атрымала незалежнасць — 25 жніўня 1991 года Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце надалі канстытуцыйны статус. Асэнсаванне мінулага — абавязковы элемент руху наперад. Так лічыць выбітны беларускі вучоны і дзеяч беларускага адраджэнскага руху, доктар навук, прафесар, Леанід Лыч. Выбранае з яго мемуараў «НЧ» і прапануе сваім чытачам.**




## СССР — кацёл русіфікацыі

Абранне ў сакавіку 1985 года Міхаіла Гарбачова генеральным сакратаром ЦК КПСС прыпала на час, калі ў краіне нечувана абвастрыліся міжнацыянальныя дачыненні. Пра гэта заяўлялася на многіх ладжаных у тыя гады ўсесаюзных навуковых канферэнцыях, прычым у прысутнасці даволі высокіх асобаў з ідэалагічнага апарату ЦК КПСС. Месцам такіх канферэнцый часцей за ўсё выбіралі сталіцы нацыянальных рэспублік.

Для многіх навукоўцаў саюзных і аўтаномных рэспублік не існавала аніякага страху за ўласны лёс, калі неабходна было давесці ўдзельнікам канферэнцыі прычыны, акрэсліць шляхі выратавання свайго народу ад культурна-моўнай русіфікацыі.

Трэба сказаць, што да такіх трывожных выказванняў вельмі ўважліва прыслухоўваліся навукоўцы з Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў Расійскай Федэрацыі. Не прыгадваю нікога, хто абыякава ставіўся б да дэфармацыі культурна-моўнага жыцця тытульных народаў саюзных і аўтаномных рэспублік. Наадварот, ад іх можна было пачуць даволі слушныя прапановы, як захаваць нацыянальнае аблічча не толькі параўнальна вялікіх па колькасці, але і малых народаў.

Запомнілася, як многія навукоўцы з рускіх гарадоў прасілі арганізатараў канферэнцый у вольны ад пасяджэнняў час вадзіць іх на тыя канцэрты, тэатральныя пастаноўкі, дзе выконваюць не рускія эстрадныя песні, ставяць не рускія драматычныя, оперныя спектаклі, а нацыянальна-моўныя. У такіх выпадках з ліку мясцовых удзельнікаў канферэнцыі заўсёды выдзялялася ў якасці гіда асоба з добрым веданнем нацыянальнай культуры і мовы, каб пры патрэбе даць тлумачэнне пра змест спектакля ці песні.

Але былі і такія, што цалкам апраўдвалі растварэнне нацыянальнай спецыфікі духоўнага жыцця карэннага насельніцтва саюзных і аўтаномных рэспублік у рускай культурна-моўнай стыхіі, апраўдваючы гэта яго інтэграцыяй у адну з перадавых у свеце культур — рускую, якой нібыта самім лёсам наканавана стаць галоўным кампанентам культуры не такога ўжо і далёкага па часе шчаслівага камуністычнага грамадства.

Адвакаты русіфікацыі любілі гаварыць і пісаць пра яе быццам бы натуральны, добраахвотны характар, не жадаючы бачыць мэтанакіраваных намаганняў агульнасаюзнага партыйнага цэнтра па ўкараненні ў нацыянальных рэспубліках рускіх культурных каштоўнасцяў, што апраўдвалася неабходнасцю інтэграцыі духоўнага жыцця на ўсіх абшарах СССР.

Разам з тым, на старонках манаграфічнай літаратуры, у матэрыялах канферэнцый сустракаліся выступленні ў ролі абаронцаў русіфікацыі асобаў з саюзных ці аўтаномных рэспублік. Зразумела, тых, што ўжо паспелі адарвацца ад пупавіны роднай зямлі, пражыць нямала гадоў па-за яе межамі. У такім жа рэчышчы імкнуліся працаваць і некаторыя з прадстаўнікоў нацыянальнай творчай інтэлігенцыі пасля вучобы ў Маскве, Ленінградзе і іншых буйных цэнтрах.

Інакш глядзелі на гэтую зусім не простую з'яву навукоўцы цвёрдай нацыянальнай арыентацыі, бачачы ў ёй магутны сродак разбурэння этнакультурнай самабытнасці нярускіх народаў, падрыву прыродных асноў іх духоўнага жыцця.

Справядліва сцвярджалі, калі творчая інтэлігенцыя той ці іншай рэспублікі будзе больш працаваць на карысць рускай, чым роднай нацыянальнай культуры, гэта з цягам часу прывядзе да поўнага заняпаду яе, а народ — да незваротнай русіфікацыі. Нават пры несумненнай мастацкай вартасці, створаныя на Беларусі рускамоўныя культурныя каштоўнасці не могуць нічога дадаць да беларускай нацыянальнай культуры.

## Крытэрый — мова

Мова — гэта адзіны правільны крытэрый вызначэння нацыянальнай прыналежнасці літаратурнага твора. Толькі з такім крытэрыям неабходна падыходзіць да ацэнкі ролі ўсіх тыпаў тэатраў, эстрадных калектываў, царкоўна-рэлігійных арганізацый.

Не баюся памыліцца ў такім уласным сцвярджэнні: адзін аўтакефальны праваслаўны прыход з абавязковым беларускамоўным набажэнствам унёс бы куды больш уклад у беларускую нацыянальную культуру, чым уся сучасная Руская праваслаўная царква на Беларусі з яе ўпартым нежаданнем выкарыстоўваць роднае слова карэннага насельніцтва нашай краіны нават у асветніцкай працы з вернікамі.

Народжаныя ў Беларусі рускамоўныя культурныя творы, несумненна, уносяць пэўны ўклад у яе культурны фонд увогуле. Як вядома, у такім фондзе Беларусі знаходзіцца велізарная колькасць твораў самых розных жанраў, прычым і не літаратурных, радзімай якіх з'яўляюцца іншыя краіны. Такія творы маюцца не толькі ў нашых бібліятэках, але і ва ўсіх буйных музеях, што сведчыць і пра багацце, і пра разнастайнасць культурнага патэнцыялу Беларусі. Аднак галоўнае, каб яго складалі пераважна ўласныя нацыянальныя каштоўнасці.

Цяжка сказаць, наколькі крытыка часткі творчай інтэлігенцыі нацыянальных рэспублік за ўдзел у стварэнні на іх тэрыторыі рускамоўных культурных каштоўнасцяў паўплывала на гэты працэс, але вядома, што некаторыя пісьменнікі ў канцы 1970-х — пачатку 1980-х гадоў перайшлі з рускага літаратурнага поля на сваё роднае і збіралі на ім неблагі ўраджай.

Нібыта ў процівагу русіфікацыі ў тыя ж гады ў некаторых з малых па колькасці народаў СССР з'явіліся нацыянальныя буквары, першыя літаратурныя творы на іх родных мовах. Усяго гэтага не назіралася б, калі б навукоўцы выразна акрэсленай арыентацыі на культурныя каштоўнасці ўласнага народа не мелі смеласці штосьці крытычнае сказаць у самых розных формах на адрас нацыянальнай палітыкі КПСС.

## Маўчанне беларусаў

І толькі беларускія навукоўцы, з усіх нярускіх навукоўцаў, такую палітыку КПСС-КПБ не крытыкавалі ні ў сваіх літаратурных працах, ні падчас выступленняў на ўсесаюзных канферэнцыях.

Прычыны былі самыя розныя, і, магчыма, адна з галоўных — адсутнасць высокага тэарэтычнага ўзроўню даследчыкаў гэтай надзвычай складанай на той час праблемы. У яе крытычным асэнсаванні мы ўступалі практычна ўсім саюзным і многім аўтаномным рэспублікам. У нас яна падавалася толькі ў пазітыўным плане, з абавязковым выказваннем вялікай падзякі агульнасаюзнаму цэнтру за бацькоўскія клопаты пра беларускую культуру.

Былі ў нас і такія навукоўцы, што лічылі проста нерэальным пры тагачаснай нацыянальнай палітыцы КПСС выратаваць беларускі народ ад канчатковай культурна-моўнай асіміляцыі. У якасці самых сур'ёзных аргументаў прыводзілі: адсутнасць нацыянальнай сістэмы народнай адукацыі, поўнае выключэнне беларускай мовы з афіцыйнага жыцця, няведанне людзьмі сваёй сапраўднай гісторыі, панаванне рускага фактару ў найважнейшых пластах прафесійнай культуры, моцную зарыентаванасць — у выніку ідэалагічнай апрацоўкі — значнай колькасці насельніцтва на інтэрнацыяналізацыю духоўнага жыцця як перадумову стварэння агульнай культуры будучага камуністычнага грамадства.

## Пратэст употай

Пра ўсе гэтыя хібы ў нацыянальным жыцці навукоўцы гаварылі толькі ўпотай між сабой, у вузкім коле аднадумцаў. На ўсесаюзныя канферэнцыі ніхто не адважваўся ехаць з такімі думкамі. А вось з іншых рэспублік без аглядкі ішлі на такі гераічны ўчынак. За гэта некаторыя траплялі ў разрад «нацыяналістаў», пазбаўляліся працы ў навуковых і навучальных установах. Найбольшым страхам гаварыць, пісаць праўду пра гаротны стан нацыянальнага жыцця на Беларусі вызначаліся навукоўцы найвышэйшых катэгорый, да голасу якіх, магчыма, і прыслухоўваліся б у партыйных ідэалагічных структурах. Што ж датычыць крытыкі бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі — найчасцей калідорнай — неаступененымі навукоўцамі, з меркаваннямі апошніх проста не лічыліся, але санкцыі супраць такіх «нацыяналістаў», пасля атрымання даносаў, ужывалі досыць суровыя.

Вельмі асцярожна паводзілі сябе пры спробах штосьці практычнае зрабіць па развязванні нацыянальнага пытання вярхі пісьменніцкай інтэлігенцыі. У лепшым выпадку іх візіты ў ЦК КПБ заканчваліся згодай гэтага высокага партыйнага органа на беларускамоўнае афармленне тэатральных афішаў, прысваенне імя якога-небудзь вядомага пісьменніка агульнаадукацыйнай школе, дапамогу ў выданні кніг і гэтак далей.

Зайздросным алімпійскім спакоем вызначалася эліта педагагічнай інтэлігенцыі. На яе вачах — а часта і пры самым актыўным удзеле — чэзла нацыянальная сістэма народнай адукацыі, а яна (эліта) і пальцам не паварушыла, каб хоць трохі навесці парадак на гэтай архіважнай дзялянцы духоўнага жыцця. З сотні юнакоў і дзяўчат з беларускамоўных сем'яў добра калі два ці тры пасля заканчэння спрэс рускамоўнай на Беларусі вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы маглі вольна карыстацца родным бацькоўскім словам. Гэтыя тыпы навучальных устаноў выступалі ў ролі магутнага гадавальніка рускамоўнай інтэлігенцыі, зусім не здольнай працаваць у рэчышчы беларускай нацыянальнай культуры.

Сказанага вышэй, думаю, дастаткова, каб зразумець, чаму з усіх тытульных народаў саюзных рэспублік беларускі аказаўся найбольш здэнацыяналізаваным і чаму яго ніхто не збіраўся ратаваць ад культурна-моўнай русіфікацыі. А супрацьстаяць ёй трэба было ўсёй грамадой, бо беларусам ужо і не ў такой аддаленай перспектыве сур'ёзна пагражала поўная асіміляцыя. Пра гэта пераканаўча папярэджвала і афіцыйная статыстыка.

## Пагроза асіміляцыі

Згодна са статыстыкай, ахоп беларускамоўным навучаннем складаў прыблізна толькі адну траціну ад усёй колькасці вучняў агульнаадукацыйных школ, дый тое галоўным чынам за кошт сельскай мясцовасці. Пры такой нізкай удзельнай вазе навучання школьнікаў у іх нацыянальнай мове ў народа няма паратунку ад асіміляцыі. Гэта агульнапрызнана сусветнай практыкай.

Усесаюзны перапіс насельніцтва 1979 года паказаў, што з усіх 15-ці саюзных рэспублік беларусы ў найбольшай ступені адышлі ад роднай мовы. Калі ў 1970 годзе 80,6% іх агульнай колькасці ў СССР прызналі беларускую мову за родную, дык у 1979 годзе — 74,2%. Няцяжка зразумець, што чакала б беларусаў праз 20–30 гадоў пры такіх высокіх тэмпах адыходу ад роднай мовы. Этнічнае выміранне!

Нягледзячы на ўсё гэта, на практыцы не рабіліся аніякія захады па спыненні такога крайне небяспечнага нацыяразбуральнага заняпаду. Хутчэй, наадварот, яму ўсяляк спрыялі рэспубліканскія і мясцовыя партыйныя і савецкія органы. Дзеля параўнання, адзначу, што ў 1979 годзе (даныя прыводзяцца ў межах усяго СССР) сваю нацыянальную мову прызналі за родную 83% украінцаў, 98 — літоўцаў, 95 — латышоў і такі ж працэнт эстонцаў.

Ніякага спадзеву на паляпшэнне моўнай сітуацыі на Беларусі ў наступныя гады за кошт яе ўнутраных рэзерваў не мелася. Для гэтага востра не ставала і нацыянальна-самасвядомых палітыкаў і інтэлігенцыі. Абсалютная бальшыня з іх дзякуючы плённай дзейнасці рускамоўнай вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы была няздольная працаваць і жыць паводле беларускіх этнакультурных стандартаў і з вялікім стараннем адрывала ад іх тых, хто яшчэ трымаўся за сваё роднае, не хацеў стаць ахвярай русіфікацыі. Выратаваць ад яе беларусаў мог толькі нейкі знадворны фактар. І ён з'явіўся на свет у форме гарбачоўскай перабудовы.

Працяг будзе

АГЛЯД

# РЫТМЫ МУЗЫЧНАГА ЛЕТА

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Нягледзячы на тое, што традыцыйна ў айчынных выканаўцаў летні перыяд лічыцца часам канікул, або, у лепшым выпадку, перыядам выступленняў на свежым паветры (open air), музычнае жыццё краіны працягваецца: нацыянальная фанаграфія за летні час папоўнілася добрым тузінам цікавых рэлізаў. Зразумела, што ўсе іх ахапіць нельга, не хопіць аніякага друкаванага месца. Таму сёння для агляду давялося адабраць толькі тры беларускія дыскі з тых, якія прадстаўляюць асноўныя кірункі сучаснай беларускай музычнай культуры — бардаўскую песню, меладычны неафолк-рок, сучасны рок авангардны скіраванасці.**

## Гукавая дарожка даўжынёй у два гады

Добрым падарункам аматарам айчыннай бардаўскай песні мусіць стаць новы рэліз ад «Радыё Свабода», супрацоўнікі якога падрыхтавалі і выдалі зборны дыск «Сто бардаў Свабоды». Трэба адзначыць, што гэты альбом — цудоўны падарунак для ўсіх аматараў беларускамоўнай аўтарскай песні і сапраўднае выпрабаванне для музычных крытыкаў, якія наважацца напісаць нешта рацыянальнае пра выданне. Справа ў тым, што яго праграма ўтрымлівае не толькі сотню сталых і маладых выканаўцаў, але і рэкордную колькасць твораў — каля пяцісот песень! Па-іншаму быць не магло: вядучы папулярнай радыёперадачы «Барды Свабоды» Зміцер Бартосік сабраў пад адной вокладкай усіх удзельнікаў свайго праекта, якія былі ў яго студыі на працягу апошніх двух гадоў і ў ёй прадстаўлялі сваю песенную творчасць.

Традыцыйна для гэтага выдання, новы дыск прадстаўляе кіраўнік «Радыё Свабода» Аляксандр Лукашук, які сваім праграмным творам «Хор бардаў» акрэслівае сутнасць сучаснай беларускай бардаўскай песні, а таксама мэту праекта «Барды Свабоды». Зміцер Барстосік як натхняльнік і вядучы гэтай унікальнай радыёперадачы працягвае тэму і распавядае пра той шлях, які прайшоў праект за два гады, пра тое, што беларускіх бардаў аб'ядноўвае: «неабыякавасць да сваёй мовы, роднай гісторыі, да будучыні нашчадкаў...»

Канцэпцыя праекта і дыска пабудавана так, што слухачоў чакае знаёмства з будучыняй нашай бардаўскай песні, з маладымі выканаўцамі. Для іх гэты дыск — своеасаблівы дэбют у масавым фанаграфічным выданні, няхай сабе і некамерцыйнага кшталту. Мо таму маладыя выканаўцы падышлі да сваёй ролі суразмоўцаў і дэбютантаў з вялікай доляй адказнасці: іх песні не паўтараюць напрацоўкі куміраў — пачынальнікаў айчыннай бардаўскай песні. Творы ў выкананні маладых аўтараў па-свойму, з новых музычных і лірычных даляглядаў, раскрываюць тыя тэмы, якія хвалююць бардаў. Тут і філасофскі роздум над сэнсам жыцця, і хрысціянская тэматыка песень, як гэта адчуваецца ў творчасці Ганны Антонавай, і тонкі гумар з лірычным адценнем, які прысутнічае ў музычных творах Васіля Аўраменкі з Магілёва, і рок-н-рольны драйв, які падкрэслівае вострую сатыру Цімафея Авіліна. Цікава, наколькі разнастайныя асобы цяпер прадстаўляюць слухачам маладое крыло айчыннай бардаўскай песні! Напрыклад, той жа згаданы Ц. Авілін захапляецца беларускай этнакасмалогіяй, пра што ён надзвычай цікава распавядае ў гутарцы з вядучым праекта «Барды Свабоды».

Новыя тэматычныя і музычныя падыходы да аўтарскай песні можна адчуць і ў спевах суворага Міхася Бараноўскага, а таксама ўладальніка шырокага вакальнага дыяпазону Васіля Бартлава, і ў музычна-паэтычных беларускіх пераўвасабленнях ірландскага фальклору Алеся Чумакова, у фальклорных традыцыях, якія спалучаюцца з бардаўскімі спевамі Ірыны Дарафейчук.

Калі музычныя і паэтычныя пошукі маладых выканаўцаў супаставіць з творчасцю нашых улюбёных аўтараў-выканаўцаў старэйшага пакалення — Алеся Камоцкага, Эдуарда Акуліна, Лявона Вольскага, Сяржука Сокалава-Воюша, Андрэя Хадановіча, Андрэя Мельнікава ды іншых, чые творы таксама шырока прадстаўлены на новым дыску, дык можна адзначыць наступнае: у беларускай бардаўскай песні няма канфлікту «бацькоў і дзяцей», а ёсць тая пераемнасць традыцый, якая забяспечвае ўсяму айчыннаму бардаўскаму руху развіццё і музычнаму пазнавальнасць, спрыяе ўзбагачэнню нацыянальнай культуры.







## Для вас, рамантыкі XXI стагоддзя!

У музычным рэпартажы, прысвечаным «Грунвальдскаму фэсту–2011», мы распавядалі пра паспяховую прэзентацыю гуртом «Rokash» свайго дэбютнага альбома «Запалі агонь». Паказальна, што дыск, прынамсі, яго сігнальны наклад, у той дзень слухачамі быў раскуплены поўнасцю. У чым прыцягальнасць гэтай працы гурта, які выконвае неафолк-рок? Бадай, у тым, што новая генерацыя слухачоў выгадаваная на фэнтэзійных творах Дж. Р.Р. Толкіена, Роберта Э. Говарда і Г. Ф. Лаўкрафта, а ўдзельнікі гурта «Rokash» прапануюць сваё фэнтэзійнае светаадчуванне, якое суадносіцца з беларускім фальклорам, легендамі і паданнямі роднага краю, з яго старажытнай міфалогіяй. Гэта не супярэчыць прыхільнасцям моладзі і дапаўняе фэнтэзійны свет слухача яркім беларускім складнікам — таямнічым, чароўным і рамантычным па-сутнасці. Мо таму моладзь, якая захапляецца творамі класікаў фэнтэзі, аддае перавагу музыцы гэтага калектыву.

Трэба адзначыць, што ў гурце «Rokash» шчасліва сышліся ў творчым тандэме аўтар тэкстаў Лявон Казакоў (бас, варган, бэк-вакал, канцэпцыя гурта) і аўтарка музыкі Паліна Дулінец (вакал). Як па класічнай формуле «інь» і «ян», у музыцы і тэкстах гурта спалучыліся жаночы рамантычны меладызм і гераічная лірыка тэкстаў песень, якая сваім каранямі ідзе ад беларускага і еўрапейскага фальклору. Гэтыя асаблівасці твораў «Rokash» робіць калектыў арыгінальнай з'явай у айчынным рок-руху.

Яшчэ больш рамантычнай робіць музыку гурта ўзнёслыя партыі флейты, на якой грае Вольга Драпеза, гукі віяланчэлі Алены Холадавай і аранжыроўкі клавішніка Міколы Ліпневіча. Гітарыст Алесь Акульчык і барабаншчык Міхаіл Кічын, якія разам з басістам Л. Казаковым не даюць слухачам падстаў для сумневу: «Rokash» — сапраўдны неафолк-рок-гурт.

Альбом гурта «Запалі агонь» утрымлівае шмат вядомых песень, якія сталі хітамі незалежнай беларускай рок-сцэны і добра вядомыя слухачам па шматлікіх канцэртах каманды. Гэта такія ўдалыя кампазіцыі, як «Крумкач», «Дух Зямлі», «Ваўкалак», у якіх магчымасці ўдзельнікаў гурта адлюстравана напоўніцу. Ну а драйвавыя песні альбома — «Запалі агонь», «Дзеці паўночнага ветру» дадаюць дэбютнаму альбому гурта «Rokash» рысы канцэптуальнасці і завершанасці.

Адзначу, што запіс, выданне і прэзентацыя альбома «Запалі агонь» сталі для гурта і своеасаблівай прыступкай ва ўдасканаленні канцэртнага гучання: каманда стала больш збалансаванай і прафесійнай, што адлюстроўваецца на настроі слухачоў. Моладзь не шкадуе апладысментаў музыкантам і дружна набывае ў свае калекцыі новы дыск, як гэта здарылася на «Грунвальдскім фэсце».

## Новая генерацыя беларускай рок-сцэны

Прапаную таксама пазнаёміцца з дэбютным альбомам «Дзевачкі і космас» магілёўскага гурта «AKUTE». Цікава, што музыканты, яка і належыць прадстаўнікам новай хвалі айчыннай рок-музыкі, сваю працу спачатку выклалі ў інтэрнэцэ для вольнага спампоўвання, а ўжо пазней выдалі яго на фірме «Вігма». Гэта нармальны прэцэдэнт для музыкантаў, якія хацелі б задзейнічаць больш рэзерваў для прасоўвання свайго прадукту ў разнастайныя асяродкі аматараў рока.

Пра тое, што ўдзельнікам «AKUTE» гэтая задача, хоць і не без цяжкасцяў, удаецца, сведчыць тое, што музыканты сталі ўладальнікам Гран-пры «Басовішча–2010», лаўрэатамі яшчэ некалькіх фестываляў, набылі шчырых прыхільнікаў як у сябе на малой радзіме, так і па ўсёй краіне. І вось навіна — дэбютны альбом перспектыўнай каманды. Безумоўна, гэтая кружэлка адразу нарадзіла шмат меркаванняў наконт таго, ці здолелі музыканты «AKUTE» пазбавіцца ўплываў каманды, якая была для іх канцэптуальным фундаментам — гурта «ГЛЮКІ»?

Лепшыя песні гэтага альбому сведчаць, што гурт на шляху да гэтай мэты: кампазіцыі «Адзіноцтва», «Прамяні» (ці «Свяці», якая заняла другое месца ў мегатуры партала «Тузіна Гітоў»), «Адшукай», «Агонь», «Павольна» — сапраўды нясуць у музычным плане нешта новае, свежае для айчыннай рок-сцэны. І гэта пры тым, што гурт складаюць трое музыкаў: Стась Мытнік — гітара, вакал, Раман Жыгараў — бас-гітара, бэк-вакал, Павал Емяльянаў — бубны. Але і ў запісу, і на канцэрце (сталічныя слухачы маглі паслухаць гурт на прэзентацыі альбома «Porna» гурта «Mauzer») гурт здзяйсняе завершанасцю ансамблевага гучання, у якім няма «праvalаў» ці «пустэчаў». Кожная нота песень «AKUTE» бышцам сведчыць пра тую працу, якую музыканты здзейснілі, перш чым сесці за запіс дыска ці выйсці на сцэну.

І хоць гурт «AKUTE» — тыповы прадукт эпохі рок-н-рола, у іх музыцы досыць новага, што з'яўляецца прывабным для сённяшніх слухачоў. Тут і незвычайныя гітарныя акорды, рыфы і хады, эмацыянальна насычаныя меладычныя ўсплёскі, досыць разнастайныя аранжыроўкі і вакальныя партыі. Да таго ж, у музыцы «AKUTE» назіраецца яшчэ адна асаблівасць — яны выкарыстоўваюць танцавальныя рытмы, якія ў спалучэнні з іх меладыямі надаюць песням альбома дадатковыя пачуццёвыя рысы, характэрныя для рок-музыкі новай эпохі. Праўда, за гэтымі эксперыментамі хаваецца небяспека зрабіцца аднастайнымі і прадказальнымі ў музыцы.

Але ў музыкантаў «AKUTE» ёсць рыса, якая можа засцерагчы іх у будучым ад памылак — іх стыльнасць, як у музыцы і лірыцы, так і сцэнічным шоў. Стыль «AKUTE» — сучасны па гучанню і мелодыцы гітарны рок, магія якога ідзе ад фанетыкі роднай мовы.

▸ МУЗЫКА

# ЗАБАРОНЕНЫ КАНЦЭРТ «NEURO DUBEL»

Мікіта БРОЎКА

**Вялікі эксклюзіўны канцэрт гурта «Neuro Dubel», які мусіў адбыцца 17 жніўня ў Loft Cafe, адменены.**




Ведаючы пра тое, што гурт знаходзіцца ў спісе забароненых, арганізатары спадзяваліся, што ўлады заплюшчаць вочы на канцэрт у невялікай зале. Але надзеі на паляпшэнне сітуацыі не спраўдзіліся. Па словах арганізатара канцэрта Паўла Кашырына, яшчэ на мінулым тыдні адміністрацыя кавярні была выклікана на размову, падчас якой ім прапанавалі ў «добраахвотна-прымусовым» парадку адмовіцца ад правядзення мерапрыемства.

Арганізатары канцэрту звярнуліся з прапановай правесці канцэрт яшчэ ў тры мінскія клубы, але паўсюль ім адмаўлялі: «Паранойя працягвае свае бясконцыя гастролі па ўсёй краіне, укараняючы страх і подласць. І няма гэтаму ні канца ні краю. Гаспадары клубаў, даведваючыся аб прапанове правесці ў іх канцэрт нашых сяброў, амаль адразу адмаўляюць. Іх можна зразумець. Яны баяцца. На іх не варта крыўдзіцца. Ім таксама не патрэбныя праблемы».

Але ў гэтым годзе гурт усё ж такі здолеў даць некалькі канцэртаў у Мінску. Адзін з іх адбыўся ў клубе «Мулен Руж», дзе яго замаскіравалі пад святкаванне дня народзінаў Аляксандра Кулінковіча, лідара гурта. Астатнія традыцыйна прайшлі ў маленечкім «Графіці», які можа змясціць толькі каля 60 чалавек.

Чарговы канцэрт гурта запланаваны на 29 жніўня ў клубе «Графіці». Гэты клуб — дзіўнае выключэнне з агульных правілаў. Нягледзячы на існаванне «чорнага спісу», свой першы мінскі канцэрт без Вольскага тут даў легендарны «N.R.M.», а на 21 жніўня запланаваны акустычны канцэрт Змітра Вайцюшкевіча.

▸ АНОНС

# ПОДЫХ УРБАНА

**31 жніўня на вольным паветры ў парку Чалюскінцаў адбудзецца фэст «Подых Урбана». Гэта выдатная магчымасць гэтым летам у апошні раз адарвацца, а таксама пакласці пачатак адкрыццю новага хіп-хап сезону.**




Што вас чакае? Жывы выступ інструментальнага хіп-хап гурта «Nice Price». Новае шоў ад «PANaNieba», якія сталі галоўным адкрыццём 2010 года. Вожык з прэзентацыяй свайго альбома, што павінен вось-вось убачыць свет. Underground-рэп у лепшых традыцыях ад гурта «Імператар» (Realize, Zeman). Першы Dubstep-рэп у Беларусі ад «Totem Method». І, вядома ж, неадназначная праграма ад Кампліта, удзельніка скандальнага гурта «Бомжпакет».

31 жніўня (пятніца). Парк Чалюскінцаў. Пачатак 17:00.

Квіткі: 20 000 — першыя 100, 25 000 — астатнія папярэдне, 30 000 — у дзень канцэрта. Усім, хто набудзе квіток папярэдне, — кампакт-дыск у падарунак! Кропкі продажу квіткоў: пераход Коласа, ГУМ, ГЦ Купалаўскі, 19 кропка, ГЦ Рыга, 18 кропка і інш.

Даведкі па тэлефоне: +375 29 649 08 88.

▸ КІНО

# СЕЦЕВЫЯ ВОЙНЫ ГАРЫ ПОТЭРА

Андрэй РАСІНСКІ

**Фантазійная сага пра Гары Потэра — не толькі забава для дзяцей і дарослых. У кнігах Джаан Роўлінг паказваецца таталітарная ўлада новага тыпу і апавядаецца, як з ёй змагацца.**



Барацьба Гары Потэра са злым чараўнікам Волан-дэ-Мортам завяршылася канчатковай перамогай дабра. Цёмныя сілы, якія доўгі час турбавалі магічны свет, разбітыя ва ўшчэнт. Цыклопы сканалі, павукі паразбягаліся, злыя ведзьмы і ведзьмакі хаваюцца па завуголлях, а ваўкалакі падзеліся невядома куды.

На экранах — апошняя частка казачна-фэнтэзійных прыгодаў ад Джаан Роўлінг, што склалі сем кнігаў ды восем фільмаў. Працягу пакуль не будзе, але пісьменніца намякнула, што праз дзесяць гадоў ён можа з'явіцца.

Кнігі Роўлінг і іх галівудскія экранізацыі набылі нечаканую палітычную актуальнасць у Беларусі (дзе ўсталявалася першая постіндустрыйная дыктатура).

У апошнім фільме цёмныя сілы атакуюць падлеткаў пасля іх апладысментаў, месцічы зляканыя, а галоўнага злога чараўніка Волан-дэ-Морта адразу параўналі з вядомым беларускім персанажам (якога таксама называць небяспечна).

Беларусь у кнізе Роўлінг не згадваецца — калі не лічыць фразы, што Гары Потэр пабіўся з вампірам пад Мінскам. Але па выхадзе «Гары Потэра і Ордэна Фенікса» беларускія школьнікі напісалі англійскай пісьменніцы. Навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэю палічылі, што Роўлінг дакладна ўзнавіла іх сітуацыю. У чароўную школу Хогвартс прызначаецца новая дырэктрыса — а ў беларускі ліцэй прыйшла дырэктарка, каб яго знішчыць (урэшце, беларускі ліцэй быў зачынены; у былой сядзібе ліцэя — суд, а школьнікі вучацца падпольна).

У кнігах англійскай пісьменніцы выкрываецца новы тып злачыннай улады. Гэтай — постындустрыйнай — уладзе не трэба сядзець на стальцы, займаць пасады і міністэрствы. Яна кіруе, не карыстаючыся дзяржаўнымі механізмамі. Гэта сецевая ўлада тэрору і страху («Той, каго нельга называць…» «Вы самі ўсё разумееце!..»)

Найперш злы чараўнік Волан-дэ-Морт арганізаваў групоўку Пажыральнікаў смерці, якая пачала забіваць нечараўнікаў і тэрарызаваць магічную супольнасць. Падобным чынам «дэбютавалі» фашысты і нацысты. Другая стадыя панавання — перарваная напаўжывым станам Волан-дэ-Морта на 11 гадоў — паставіць сваіх людзей у міністэрствах. Цяпер у гэтыя міністэрствы не абавязкова прыходзіць самім — дастаткова падпарадкаваць чыноўнікаў страхам і прамыўкай мазгоў (у магічным варыянце чары «Імперыа»). На гэтым этапе нейтралізуюцца сілы бяспекі і скіроўваюцца супраць ворагаў. Фінансавы апарат таксама працуе на тэрарыстаў.

Надалей — і паралельна — адбываюцца мутацыі сродкаў масавай інфармацыі. Іх зусім не трэба зачыняць, а страх — не самы галоўны матыў замененых журналістаў. Тут пануе падкінутая ведзьмакамі хлусня, а рэй вядуць штучныя скандалы, што пляжаць добрых людзей. Дабро мяшаецца з брудам, годныя героі выкрываюцца як нікчэмнасці, салідарнасць касуецца.

Але галоўная мэта — не прэм'ерства, банкі і крамы. Крыніца ўлады ў сучасную, постындустрыйную эпоху — школа, універсітэт (менавіта за іх ідзе вырашальны бой). Хто валодае школай — той валодае мінулым, той кантралюе сучаснасць — і скрыўляе гісторыю.

У школу непасрэдна прызначаюцца свае людзі (адных чараў падпарадкавання ўжо недастаткова). Моладзь атручваецца ксенафобіяй, нянавісцю, злосцю і цёмнымі думкамі. Дзяцей вучаць катаваць і нават забіваць іншых. Школа цалкам змяняецца: ліквідуюцца старыя вольнасці і ўспаміны пра колішніх добрых герояў.

Волан-дэ-Морт напоўніцу рэалізуе гегемонію па Грамшы, захапіўшы прастору культуры.

Супраць такой тэрарыстычнай групоўкі здольная эфектыўна выступіць толькі такая ж сецевая арганізацыя. У кнігах — гэта «Ордэн Фенікса» і часткова школьная «Армія Дамблдора». Антытаталітарны супраціў складаецца з сяброў і таварышаў: сецевыя ордэны звязаныя з людзьмі, а не структурамі. Гэтыя людзі — з годнасцю і здольнасцю абараняць дабро.

Сродкі барацьбы — партызанскія: падпольнае радыё, зашыфраваныя дамоўленыя пасланні (напрыклад, манеты) — зразумелыя толькі сябрам звязкаў.

Але галоўная зброя барацьбы з пануючай тэрарыстычнай уладай — не тэхніка і магічныя артэфакты. Калі сецевая тэрарыстычная ўлада — гэта самота і страх, то пераадоленне зла — ахвярнасць, любоў, салідарнасць.

У Гары Потэра перамагчы атрымалася. Чаму не атрымліваецца ў беларусаў?

▸ АБ'ЯВА

### Яны набліжалі нашу незалежнасць!

У межах кампаніі «Будзьма» Таварыства беларускай мовы праводзіць сустрэчы з дэпутатамі Вярхоўнага Савета Беларусі 12 склікання, прысвечаныя дваццатым угодкам абвяшчэння незалежнасці Беларусі.

**22 жніўня 2011 г.** — сустрэча з **Лявонам Баршчэўскім**

**24 жніўня 2011 г.** — сустрэча з **Валянцінам Голубевым**

**25 жніўня 2011 г.** — сустрэча з **Алегам Трусавым**

Месца правядзення — Сядзіба ТБМ, вул. Румянцава, 13, час — 18.00 – 20.00.

Запрашаем!

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 880

Падпісана да друку 19.08.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.